Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

4 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 1 (26114)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Фота БЕЛТА.

НАВАГОДНІ ЗВАРОТ

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі 31 снежня 2007 г.

Дарагія сябры!

Новы год — гэта сямейнае свята. Яно такое не толькі для родных, але і для ўсіх нас, вялікай сям'і — народа Беларусі.

У гэтыя хвіліны мы асабліва адчуваем сваё адзінства: рабочы і Прэзідэнт, селянін і прадпрымальнік, дырэктар завода і настаўнік, урач і ваенны.

Мы — нацыя. Нацыя, якая не раздзіраецца палітычнай барацьбой і перадзелам уласнасці, а згуртаваная агульнай мэтай добраўпарадкавання нашай Айчыны. Бо народ, які пусціў смуту ў свой дом, асуджаны на знікненне.

Кожны год прыносіць як поспехі, так і праблемы. Перад боем курантаў мы ўспамінаем і тое, і другое.

Калі гаварыць шчыра, адыходзячы год быў, бадай, самым складаным у гісторыі нашай маладой дзяржавы. Вельмі жорсткі палітычны і эканамічны націск, увядзенне розных санкцый, патокі няпраўды і дэзінфармацыі.

Лідары некаторых краін, каб адцягнуць увагу ад сваіх праблем, раптам «заклапоціліся» сітуацыяй у Беларусі. Забываючыся пры гэтым, што размова ідзе не аб нейкім штаце ў іх уласнай дзяржаве, а аб суверэннай еўрапейскай дзяржаве.

Да чаго прыводзіць такая «дэмакратызацыя», наглядна праявілася ў Югаславіі, Іраку, Афганістане, ды і на тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Бясконцыя палітычныя інтрыгі, карупцыя, эканамічны спад, разруха. Але самае галоўнае — гэтыя краіны трапілі ў поўную залежнасць да сваіх «настаўнікаў».

Нам жа не могуць дараваць, што Беларусь, якая выпакутавала сваю незалежнасць, не згаджаецца стаць іх марыянеткай.

Самай сур'ёзнай праверкай на трываласць нашай эканомікі стаў рост цэнаў на энергарэсурсы. Сёння можна сказаць адкрыта: па сваіх наступствах гэта такі магутны ўдар, які любую краіну мог бы прывесці да абвалу.

Але нас не ўдалося паставіць на калені. Вялікія цяжкасці толькі загартоўваюць. Мы не проста выстаялі. Мы забяспечылі развіццё нашай краіны.

Працавітасць, мужнасць, мудрасць беларускага народа заслугоўваюць самай глыбокай удзячнасці!

Тыя, хто прадказваў нам немінучы крах, і тыя, хто яго нам жадаў, не ўлічылі галоўнага: мы сталі адзінай, згуртаванай нацыяй — маладой, энергічнай, моцнай духам.

За гады станаўлення суверэнітэту, пераадольваючы неймавернымя цяжкасці, беларускі народ узмужнеў і гатовы ўсімі сродкамі адстойваць уласны шлях развіцця.

Паклаўшы на шалі плюсы і мінусы адыходзячага года, разумееш, што яго праблемы яшчэ больш нас загартавалі і даказалі гістарычны факт — Беларусь адбылася як незалежная, самадастатковая дзяржава.

Дарагія суайчыннікі!

Цяжкасці навучылі нас жыць па сродках, беражліва, па-гаспадарску, з любоўю адносіцца да сваёй Айчыны.

Перыяд выжывання пройдзены ўжо. Сёння вырашаюцца якасна новыя задачы — паскоранае і інавацыйнае развіццё эканомікі.

У гэты найцяжэйшы год адкрыты 24 новыя вытворчасці. Сярод іх такія ўнікальныя, як выпуск газетнай паперы, вытворчасць бясшвовых труб, вагонаў, бытавой тэхнікі, дызельнага рухавіка чацвёртага пакалення, біяпаліва і шэраг іншых, аб якіх нават не марылі ў савецкія часы.

Паглядзіце, як узнялася сельская гаспадарка. Мы ўжо не змагаемся за ўраджай, як у мінулыя гады. Працуем спакойна і сістэмна, прымяняючы айчынную тэхніку і ўласныя найноўшыя тэхналогіі, пастаянна дабіваючыся высокіх вынікаў на палях і фермах.

2007 год увойдзе ў гісторыю і тым, што ўпершыню беларуская нафта была здабыта на амерыканскім кантыненце. Мы ствараем вытворчасці не толькі ў сваёй краіне, але і за яе межамі. Нашы інвестыцыі пайшлі ўжо ў Венесуэлу, Кітай, Іран, іншыя рэгіёны планеты. Беларускія гандлёвыя маркі набываюць сусветную прапіску.

Шматвектарнасць нашай знешняй палітыкі атрымлівае новае гучанне і маштаб. Мы адданыя як традыцыйным саюзнікам, так і адкрыты для новых партнёраў.

Дарагія землякі!

Бадай, самую радасную навіну прынёс нам Год дзіцяці, якім быў аб'яўлены 2007 год. Колькасць маленькіх грамадзян Беларусі значна павялічылася.

І я хачу ад усяго сэрца падзякаваць нашым цудоўным жанчынам, маці за гэты бясцэнны падарунак. Вы даяце жыццё не толькі дзецям, але і сваёй краіне. Нізкі вам паклон!

Проста цудоўна, што становіцца ганаровым і прэстыжным мець у сем'ях траіх і больш дзяцей. Ужо сёння мы дасягнулі ўзроўню нараджальнасці, які прагназаваўся толькі на канец бягучай пяцігодкі.

Гэта значыць, што бацькі вераць у будучыню сваіх дзяцей і будучыню Беларусі.

Вядома, дзяржава — не Дзед Мароз, які можа прыносіць падарункі і раздаваць абяцанні.

Зразумела, што і ў наступным годзе будзе нямала праблем і цяжкасцяў.

Але краіна прадоўжыць імклівы рух наперад.

Мы значна павялічым будаўніцтва жылля.

Па-сапраўднаму адродзім малыя гарады і вёскі, зробім усё, каб у іх людзям жылося не горш, чым у сталіцы.

У новых эканамічных рэаліях будуць створаны спрыяльныя ўмовы для свабоднага развіцця прыватнай ініцыятывы.

У наступным годзе павінен быць канчаткова завершаны працэс дэбюракратызацыі. Гэта своеасаблівы экзамен для ўсіх органаў улады.

Дзяржава забяспечыць рост зарплат, пенсій, стыпендый. Асаблівую ўвагу ўдзелім сацыяльна неабароненым і малазабяспечаным грамадзянам. Ні адзін, хто мае патрэбу ў дзяржаўнай дапамозе, без яе не застанецца.

Але самае галоўнае — гэта здароўе людзей.

Таму 2008 год будзе аб'яўлены ў Беларусі Годам здароўя. У самым шырокім сэнсе гэтага слова: здароўя чалавека, сям'і, грамадства і краіны. Намаганні трэба накіраваць на развіццё медыцыны, адукацыі, спорту, фарміраванне здаровага ладу жыцця і культуры ўзаемаадносінаў, на абарону экалогіі і маральных каштоўнасцяў.

Разам, усёй краінай, мы павінны ствараць свет, дастойны нашых дзяцей, камфортны для кожнага жыхара Беларусі, утульны для нашых гасцей.

Дарагія сябры!

Гаспадзь падарыў нам цудоўны край, напоўнены душэўнай прыгажосцю. Дык давайце берагчы нашу святую зямлю з пяшчотным імем Беларусь.

Няхай у новым годзе вашы дамы саграваюцца цяплом сямейнага ачага, а дзіцячыя малюнкі ажыўляюць іх толькі яркімі фарбамі.

Пакіньце ў мінулым адзіноту, нягоды і смутак.

Адкрыйце свае сэрцы любові, дабру, спачуванню і ўзаемаразуменню.

Ад усёй душы жадаю кожнаму з вас шчасця, удачы, новых перамог і здзяйсненняў, міру і дабрабыту.

З новым годам, сябры!

Фота БЕЛТА.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1

Аб аб'яўленні 2008 года Годам здароўя

У мэтах стварэння ўмоў для далейшага фарміравання здаровага ладу жыцця, развіцця аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту, забеспячэння экалагічнай бяспекі, захаванасці маральных каштоўнасцяў і культуры ўзаемаадносінаў:

1. Аб'явіць у Рэспубліцы Беларусь 2008 год Годам здароўя.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіць склад арганізацыйнага камітэта і рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2008 годзе Года здароўя і прыняць іншыя меры па рэалізацыі гэтага Указа.

3. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму зацвердзіць рэгіянальныя планы мерапрыемстваў па правядзенні ў 2008 годзе Года здароўя.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

1 студзеня 2008 г., г. Мінск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 685

Аб дадатковых умовах ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці

У мэтах стварэння дадатковых умоў для ўтварэння прыватнага ўнітарнага прадпрыемства і яго дзейнасці, індывідуальнымі прадпрымальнікамі камерцыйных арганізацый:

1. Устанавіць, што:

1.1. фізічныя асобы, зарэгістраваныя да 1 студзеня 2008 г. у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў (далей — індывідуальныя прадпрымальнікі), маюць права ствараць камерцыйныя арганізацыі ў форме прыватнага ўнітарнага прадпрыемства ў парадку і на ўмовах, вызначаных Палажэннем аб парадку стварэння індывідуальным прадпрымальнікам прыватнага ўнітарнага прадпрыемства і яго дзейнасці, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2007 г. № 302 (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 159, 1/8700; № 250, 1/8995), і Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 496 «Аб удасканаленні парадку стварэння індывідуальнымі прадпрыемствамі прыватных унітарных прадпрыемстваў і іх дзейнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 250, 1/8995) (далей — унітарнае прадпрыемства).

Пры гэтым індывідуальны прадпрымальнік для дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства павінен звярнуцца ў рэгіструючы орган не пазней за 1 сакавіка 2008 г.

Да звароту ў рэгіструючы орган для дзяржаўнай рэгістрацыі унітарнага прадпрыемства, але не пазней за 15 лютага 2008 г., індывідуальны прадпрымальнік мае права падаць у падатковы орган заяву аб вяртанні перавышэння сум падатковых вылікаў;

1.2. на ўнітарныя прадпрыемствы пры ўчыненні імі па 31 снежня 2009 г. адміністрацыйных правапарушэнняў накладаюцца адміністрацыйныя спагнанні ў выглядзе штрафу ў памеры, зменшаным у два разы, або ў межах мінімальных і максімальных памераў, зменшаных у два разы.

Палажэнні гэтага падпункта прымяняюцца да ўнітарных прадпрыемстваў пры ўмове добраахвотнага пакрыцця або ўстаранення нанесенай шкоды або выканання ўскладзенага на іх абавязку, за невыкананне якога накладаецца адміністрацыйнае спагнанне, а таксама пры наяўнасці іншых абставінаў, прызнаных змякчаючымі судом, органам, які вядзе адміністрацыйны працэс, і адсутнасці абставінаў, абцяжваючых адміністрацыйную адказнасць.

2. Унесці змяненні і дапаўненне ў Палажэнне аб парадку стварэння індывідуальнымі прадпрымальнікамі камерцыйных арганізацый, зацверджанае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2007 г. № 302 (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 159, 1/8700):

у пункце 1 словы «1 студзеня 2007 г.» замяніць словамі «1 студзеня 2008 г.»;

у частцы першай пункта 2:

у абзацы першым словы «10 лістапада 2007 г.» замяніць словамі «1 сакавіка 2008 г.»;

абзацы трэці, чацвёрты і сёмы выключыць;

абзацы пяты, шосты, восьмы лічыць адпаведна абзацамі трэцім — пятым;

дапоўніць пункт пасля частак першай часткамі другой і трэцяй наступнага зместу:

«Для дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарных прадпрыемстваў, месца знаходжання якіх прадугледжваецца ў жылых памяшканнях у адпаведнасці з пунктам 5 гэтага Палажэння, дадаткова прадстаўляецца дакумент, які дазвальджае права ўласнасці (права долевай уласнасці) на жылое памяшканне фізічнай асобы — уласніка маёмасці ўнітарнага прадпрыемства, заяву аб згодзе ўласніка (саўласніка) жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду, а таксама ўсіх паўналетніх членаў сям'і ўласніка (саўласніка) жылога памяшкання, якія пражываюць у жылым памяшканні, на размяшчэнне ў такім памяшканні гэтага ўнітарнага прадпрыемства.

Да падачы ў рэгіструючы орган для дзяржаўнай рэгістрацыі ўнітарнага прадпрыемства дакументаў, названых у частцы першай гэтага пункта, індывідуальны прадпрымальнік павінен узгадніць з гэтым органам яго назву.»;

часткі другую і трэцюю лічыць адпаведна часткамі чацвёртай і пятай;

у частцы першай пункта 4 словы «15 кастрычніка 2007 г.» замяніць словамі «15 лютага 2008 г.»;

з часткі першай пункта 6 другі сказ выключыць;

у пункце 9 словы «рэгістрацыйны збор» замяніць словамі «дзяржаўная пошліна»;

у частцы першай пункта 11 слова «трыццаці календарных» замяніць словам «пятнаццаці рабочых».

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму прыняць меры па рэалізацыі гэтага Указа.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2008 г.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

29 снежня 2007 г., г. Мінск.

Калядны турнір аматараў хакея стартуе ў Мінску

З 4 па 7 снежня ў Мінску пройдзе IV Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У ім возьмуць удзел восем камандаў, якія падзелены на дзве групы: А (Беларусь, Канада, Швейцарыя, Аўстрыя) і В (Расія, Германія, Фінляндыя і Украіна). Матчы пройдуць на лядовых пляцоўках Палаца спорту (каманды групы А) і Мінскага лядовага палаца спорту (каманды групы В).

Як адзначыў старшыня Беларускай федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў, яшчэ ніколі каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не рыхтавалася да турніру так актыўна, што тлумачыцца яе жаданнем вярнуць страчаны летась трафей. Нагадаем, што на двух першых турнірах перамагала беларуская каманда, летась жа беларусы саступілі ў фінале камандзе «Газпрама» з Расіі. Дарэчы, гэта каманда пажадала пакінуць у сябе ганаровы трафей, таму да сёлетняга турніру Прэзідэнцкі спартыўны клуб падрыхтаваў новы кубак. Сёлета, як заўважыў Уладзімір Навумаў, расійская федэрацыя хакея ўпаўнаважыла прадстаўляць краіну іншую каманду. Гэта будзе даволі маладая дружына (сярэдні ўзрост ігракоў 27—29 гадоў) з Тальяці. Асаблівасцю сёлетняга турніру, дарэчы, стане адносна малады ўзрост (30—40 гадоў) яго ўдзельнікаў. Сярод камандаў-фаварытаў, якія будуць змагацца за галоўны прыз, можна вылучыць традыцыйна моцную беларускую каманду, а таксама каманды Канады, Аўстрыі і Фінляндыі. Як адзначыў міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў, кожная каманда можа паднесці сюрпрыз.

Адкрыццё Каляднага міжнароднага турніру адбудзецца сёння, у 18 гадзін у Палацы спорту. З 14 гадзін на пляцоўцы побач з Палацам спорту пачнецца святочная праграма з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці і юных спартсменаў. Адкрыццё турніру пройдзе пад дэвізам «Усе дарогі вядуць у Беларусь». Як растлумачыў Аляксандр Грыгараў, такі дэвіз абраны невыпадкова. Летась у Беларусь прыехалі 3 мільёны 600 тысяч гасцей са 119 краін свету. «Відавочна, што Беларусь робіцца больш прывабнай для замежных турыстаў, у тым ліку і дзякуючы такім спаборніцтвам, як Калядны турнір аматараў хакея», — заўважыў міністр спорту і турызму. Вопыт правядзення такіх міжнародных турніраў будзе не лішнім — наша краіна будзе прэтэндаваць на правядзенне чэмпіянату свету сярод прафесіяналаў.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ АЛЯКСАНДР АБДУЛАЎ

У Маскве на 55-м годзе жыцця памёр вядомы акцёр Аляксандр Абдулаў. Гэта адбылося ў 7:20 у чацвер у Цэнтры сардэчна-сасудзістай хірургіі імя Бакулева.

Аляксандр Гаўрылавіч цяжка хварэў — на пачатку верасня 2007 года ўрачы адной з ізраільскіх клінік выявілі ў яго рак лёгкіх чацвёртай стадыі. Хвароба паразіла і іншыя ўнутраныя органы — пячонку, ныркі, падстраўнікавую залозу. Гэтая стадыя раку лічыцца невылечнай.

Народны артыст Расіі Аляксандр Абдулаў апошні раз з'яўляўся на публіцы ў сярэдзіне снежня мінулага года. Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін уручыў яму ордэн «За заслугі перад Айчынай» чацвёртай ступені.

Шырокую вядомасць і папулярнасць Абдулаву прынеслі яго работы ў кіно: «Звычайны цуд», «Той самы Мюнхгаўзен», «Дом, які пабудаваў Свіфт», «Формула кахання», «Забіць дракона», «Геній».

Развітанне з акцёрам адбудзецца 5 студзеня ў маскоўскім тэатры «Ленком». У гэты ж дзень, паводле слоў сябра Абдулава вядомага акцёра Леаніда Ярмольніка, пройдзе і пахаванне любімага многімі пакаленнямі артыста. Між тым, паводле інфармацыі крыніцы ў гарадскіх уладах, пахаваны Абдулаў будзе 6 студзеня на Ваганькаўскіх могілках.

У СЕКТАРЫ ГАЗА ІЗРАІЛЬ ВЫКАРЫСТАЎ АВІЯЦЫЮ І АРТЫЛЕРЫЮ

У сектары Газа ізраільскія войскі нанеслі некалькі авіяцыйных і артылерыйскіх удараў па мяркуемых пазіцыях баевікоў. У выніку абстрэлаў загінула і пацярпела больш за 20 чалавек.

Пяць палесцінцаў загінулі, яшчэ шаснаццаць чалавек аказаліся параненымі пасля абстрэлу ў раёне Хан-Юніса. Прычым двое з загінулых — мірныя жыхары. Гэтыя дзеянні Ізраіля сталі адказам на напад баевікоў, якія абстралялі групу вайскоўцаў, што праводзілі аперацыю па пошуку і знішчэнню ракетных пляцовак.

ПОЛЬСКАЯ ПАЛІЦЫЯ 10 ГАДОЎ НЕ МОЖА ЗЛАВІЦЬ 80-ГАДОВАГА ЛАВЕЛАСА-МАХЛЯРА

Польская паліцыя звярнулася па дапамогу да суграмадзян у лоўлі васьмідзесяцігадовага махляра, які, пакінуўшы без грошай мноства незамужніх дам, хаваецца ад правасуддзя ўжо дзесяты год.

Яўгеніуш Гадомскі мае рост 170—175 сантыметраў, карыя вочы, сівыя валасы (аднак можа і пафарбавацца), магчыма, носіць вусы. Часта мяняе прычоскі. У свой час махляр незаконна завалодаў значнай сумай грошай, якая была яму выплачана ў якасці кампенсацыі за бяццам бы праведзены час у канцэнтрацыйным лагеры падчас Другой сусветнай вайны. Пазней высветлілася, што ў канцлагеры Гадомскі ніколі не быў. Аднак на гэтым псеўда-вязень не спыніўся: з дапамогай службаў знаёмстваў Гадомскі адшукваў адзінокіх панянак, якім не хапала мужчынскай увагі, а затым выкрадаў іх зберажэнні. На арышт махляра ўжо выпісана некалькі ордэраў, аднак паліцыя не можа яго злавіць з 1998 года.

АДСВЯТКАВАЛІ НОВЫ ГОД СПАКОЙНА

Паводле даных упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у ноч на 1 студзеня ў навагодніх мерапрыемствах узялі ўдзел звыш 780 тысяч чалавек.

Праваахоўнікам удалося забяспечыць парадак у грамадскіх месцах святкавання Новага года — тут не было дапушчана парушэнняў. Да таго ж, адметна, што ў параўнанні з папярэднімі днямі, менш было зарэгістравана крадзяжоў, разбойных нападаў і рабаўніцтваў. Больш спакойна было і на дарогах краіны: учынена ў тры разы менш дарожна-транспартных здарэнняў, але ўсё ж у ДТЗ загінулі 2 чалавекі. Як адзначаюць у міністэрстве, падчас навагодніх святаў колькасць зарэгістраваных злачынстваў была ў 2 разы меншай, чым у звычайныя дні. Між іншым, такая тэндэнцыя захоўваецца ўжо на працягу некалькіх апошніх гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

НОВЫЯ МАРКІ

29 снежня 2007 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяло ў паштовае абарачэнне серыю з пяці марак «Сельскагаспадарчыя жывёлы. Свойская жывёла», падрыхтаваныя ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастак Марыя Плахатнюк.

Тэрмін пераўтварэння ІП ва УП падоўжаны

Погляд

Цяпер гэта 1 сакавіка новага года

Падаўжэнне тэрміну стварэння індывідуальнымі прадпрымальнікамі прыватных унітарных прадпрыемстваў — гэта галоўная адметнасць прэзідэнцкага Указа № 685, які выдадзены напярэдадні навагодніх святаў. Прычым адразу ж варта ўдакладніць: гаворка ідзе аб спрошчаным парадку стварэння прыватных унітарных прадпрыемстваў.

Як паведаміла на прэс-канферэнцыі начальнік Галоўнага эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Іна Мядзведзева, акрамя падаўжэння для ІП тэрміну спрошчанага парадку рэгістрацыі прыватных унітарных прадпрыемстваў, указам у дачыненні да такіх навастворaных прадпрыемстваў у два разы зніжаны памеры вызначаных эканамічных санкцый за магчымыя адміністрацыйныя парушэнні. «У сувязі з павелічэннем вераграднасці допуску тых ці іншых парушэнняў заканадаўства на пачатковым этапе дзейнасці такіх прадпрыемстваў, прымяненне за гэта санкцый, зменшаных напалову, дазволіць прыватным унітарным прадпрыемствам пазбегнуць магчымых фінансавых цяжкасцяў». Тэрмін дзеяння палегчаных санкцый — да канца 2009 года.

Што ляжыць у аснове настойлівага схілення індывідуальных прадпрымальнікаў да рэгістрацыі імі прыватных унітарных прадпрыемстваў (для стварэння найбольш спрыяльных умоў па такім пераходзе яшчэ раней былі прынятыя самыя розныя меры: спрошчаны сам парадак рэгістрацыі такіх прадпрыемстваў, удасканалена сістэма падаткаабкладання і г.д.)? У аснове — найперш выраўноўванне ўмоў гаспадарання для ўсіх суб'ектаў, стварэнне аднолькавых умоў для іх канкурэнцыі.

Да раней вызначанага тэрміну 10 лістапада «пераўтварыліся» ў прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы 11 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, і налічваецца недзе каля 20 тысяч прадпрымальнікаў, якія маглі б прайсці гэту працэдуру. Новы ўказ і дае ім такую магчымасць.

Як падкрэслівалася падчас прэс-канферэнцыі, зроблена ўсё максімальнае з таго, што магло б палегчыць пераход індывідуальных прадпрымальнікаў да работы ў форме юрыдычных асобаў; адпаведныя пытанні абмяркоўваліся на розных узроўнях, у тым ліку і на вышэйшым, пры гэтым звернута ўвага на тое, каб бездакорна захоўваліся ўсе правы індывідуальных прадпрымальнікаў у іх адносінах з арэндадаўцамі.

Да ўсяго гэтага варта дадаць: дрэнна ці добра будзе весці сваю дзейнасць у форме унітарных прадпрыемстваў — ацэньваць найперш самім прадпрымальнікам. Гаворка ж пра іншае. Мяне асабіста насцярожвае, мякка кажучы, рэзкасць некаторых выказванняў асобных каментатараў у дачыненні да іх, якая прагучала апошнім часам з тэлеэкранаў у сувязі з гэтай акцыяй... Так, іншым разам вельмі непрывабны твар «паказваюць» асобныя прадстаўнікі гэтага дробнага бізнэсу, вядома — «лавачнага». Але пакуль што яны яўна запатрабаваны немалой часткай грамадства, калі не яго большасцю, і гэта — галоўнае. Пакуль што многія, абнаўляючы свой гардэроб, аддаюць яўную перавагу менавіта тым жа нялюбым рынкам. Там і танней, і больш разнастайна. Стануць людзі багацейшымі, а пры гэтым будзе па-сапраўднаму ўлічваць усе іх запатрабаванні лёгкая прамысловасць, многія прадпрыемствы якой, як і раней, гоняць не вельмі адметны «шырспажыў» і якой прадпрымальнікі як быццам «перашкаджаюць», — і ўсе гэтыя дробныя індывідуалы-лавачнікі знікнуць самі па сабе.

Іван АЛЯКСАНДРАЎ.

ISSN 1990 - 763X

САВЕТ «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

Заканчваецца падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2008 года. Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

Увага: «прамая лінія»!

Як набыць зямельныя ўчасткі

З першага студзеня ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 667 ад 27 снежня 2007 года. Менавіта гэты комплексны дакумент будзе рэгуляваць зямельныя адносіны ў нашай краіне. Асобна ва ўказе

На пытанні па зямельнай тэматыцы нашым чытачам падчас «прамой лініі» адкажа намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь **Андрэй Анатольевіч ГАЕЎ**.

«Прамая лінія» адбудзецца СЁННЯ з 11.00 да 12.30 па нумарах: 8(017) 292 38 92 і 292 38 21.

Андрэй ГАЕЎ:

«НОВАЯ ПРАЦЭДУРА ПРАДАСТАЎЛЕННЯ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ МАЕ СУЧАСНЫ ПАДЫХОД»

Напрыканцы мінулага года кіраўнік дзяржавы падпісаў указ № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў». Паводле слоў намесніка дырэктара Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Валерыя Дарашкевіча, галоўнай задачай дадзенага дакумента з'яўляецца максімальнае спрашчэнне бюракратычных працэдур у сферы прадастаўлення і адабрання зямельных участкаў. Механізм дадзенай працэдуры павінен забяспечыць зразумелы і празрысты, просты і даступны алгарытм атрымання зямельнага ўчастка для ўсіх катэгорый грамадзян, што цалкам выключыць любыя карупцыйныя дзеянні чыноўнікаў на ўсіх узроўнях.

Намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Андрэй Гаеў лічыць, што новым указам цалкам выключаецца любая магчымасць выкарыстоўваць шэрыя схемы атрымання зямельных участкаў на не зусім законных падставах. Для гэтага ўказам замацоўваецца агульнае правіла прадастаўлення зямельных участкаў — па выніках аўкцыёнаў. Указ прадугледжвае тры віды аўкцыёнаў: на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў; па продажы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам і юрыдычным асобам, калі гэта прадугледжана заканадаўчымі актамі; аўкцыёны з умовамі для сталіцы і абласных цэнтраў на права праектавання і будаўніцтва капітальных пабудоў.

Для асобных катэгорый фізічных асобаў зямельныя ўчасткі могуць прадастаўляцца без правядзення аўкцыённых таргоў. Гэта датычыцца грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, калі яны пастаянна жывуць і працуюць на тэрыторыі населеных пунктаў, акрамя Мінска і абласных цэнтраў. Такія ўчасткі прадастаўляюцца для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў. У Мінску і абласных цэнтрах зямельныя ўчасткі магчыма будзе набыць толькі па выніках аўкцыёнаў, бо зямля тут мае даволі вялікі кошт і павышаны попыт, а свабодных зямельных участкаў ужо практычна не засталося.

Жыхарам краіны без аўкцыённых таргоў будуць прадастаўляцца зямельныя ўчасткі ў сельскіх населеных пунктах для вядзення асабістай падсобнай, сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, агародніцтва, сенакосу, выпасу жывёлы, для будаўніцтва часовых індывідуальных гаражоў і ў іншых выпадках. Указам канкрэтызавана норма па прадастаўленні зямельных участкаў для будаўніцтва і абслугоўвання шматкватэрных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў. Зараз дакладна вызначана, што зямельныя ўчасткі на гэтыя мэты будуць прадастаўляцца толькі ў пастаянае і (або) часовае карыстанне, а не ў арэнду. Спецыялісты лічаць, што такая норма закона паспрыяе захаваць і ў далейшым кошт узводзімага жылля на ранейшым узроўні. Больш падрабязна аб нормах указа № 667 выданне праінфармуе сваіх чытачоў па выніках сённяшняй «прамой лініі» «Звязды» з удзелам намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэя Анатольевіча Гаева ўжо на наступным тыдні.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДА 6 СТУДЗЕНЯ ЗАХАВАЮЦЦА МОЦНЫЯ МАРАЗЫ, УНАЧЫ МЕСЦАМІ МІНУС 20

Ажно да нядзелі ўключна на тэрыторыі Беларусі будзе даволі марозна, — паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

У пятніцу і суботу ў рэспубліцы будзе без істотных ападкаў, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы 11—17 градусаў марозу, па ўсходзе пры праясненнях да мінус 20 градусаў, удзень ад 7 да 14 градусаў марозу. У нядзелю чакаецца моцны парывісты паўднёва-ўсходні вецер, снегапады ў заходніх раёнах краіны. Уначы будзе ад мінус 8 градусаў па захадзе — да 18 градусаў марозу па ўсходзе краіны; удзень — 4—10, па ўсходзе да мінус 13 градусаў.

У панядзелак снегапады з завірухамі будуць назірацца па ўсёй краіне. На ўсходзе захаваецца моцны парывісты вецер. Аднак маразы пачнуць слабець. Уначы мінус 5—12 градусаў, удзень — мінус 1—7.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛЕБЯДЗІНАЯ ПЕСНЯ СА ШЧАСЛІВЫМ КАНЦОМ

Як пачынае мацнець мароз, ды яшчэ ў святочныя дні, медыкі і праваахоўнікі падлічваюць ахвяры зімы. Абмарожаныя твары, вушы, канечнасці па прычыне неабачлівасці — у такія дні не рэдкасць. А вось у Жабінкаўскім раёне ад марозу пацярпеў птах. Белы лебедзь літаральна ўмёрз у тым месцы, дзе маленькая рака Трасцяніца ўпадае ў Мухавец недалёка ад санаторыя «Буг». У раённую інспекцыю аховы прыроды паведамілі аб гэтым ранкам першага пасляСвяточнага дня.

Калі начальнік райінспекцыі Сяргей Штык, яе супрацоўнік Аляксандр Вяркеенка і старшы егер паляўнічай гаспадаркі Алег Шчытаў прыехалі на месца, белы прыгажун быў поўнасцю акружаны лёдам і мог толькі злёгку варушыць шыяй. Ён ціха сядзеў і пакорліва чакаў канца. Калі да яго ўсё ж дабраліся па танюсенькім лёдзе і высеклі сякерай з ледзянога палону, лебедзь паводзіў сябе паслухмяна. Птушку змясцілі ў машыну і завезлі на цёплы канал у раёне цукровага завода. Там вада ніколі не замярзае, на зімоўку застаюцца качкі.

Выратаваны лебедзь адразу паплыў па вадзе, не адмовіўся і ад пачастунку, які яму на развітанне прапанавалі яго выратавальнікі.

Святлана ЯСКЕВІЧ, *Жабінкаўскі раён.*

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 162,33
1 латвійскі лат	4 527,75
1 літоўскі літ	915,83
1 чэшская крона	120,34
1 польскі злоты	875,48
1 расійскі рубель	87,61
1 украінская грыўня	425,74

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,5462
10 UAH	48,2357
1000 BYR	11,3897
EUR	35,9332

Курс у гандлёвых кампаніях (на 3.01.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже жилого дома об. пл. 64,5 кв.м, расположенного на земельном участке пл. 0,1240 га (водоохранная зона реки Сервечь), по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г.п. Кривичи, ул. Набережная, д. 13. Начальная цена — 16 682 815 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2007 г. Аукцион состоится 22.01.2008 г. в 12.00 по адрес

Дзецям з пацярпелых ад радыяцыі раёнаў прадастаўлены льготы па выездзе на лячэнне ў санаторыях

Кіраўнік дзяржавы падпісаў 28 снежня Указ № 680 «Аб унясенні дапаўнення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 жніўня 2006 г. № 542».

Гэты нарматыўны акт прадастаўляе льготы па выездзе на лячэнне ў санаторна-курортныя арганізацыі Беларусі, размешчаныя за яе межамі, непаўналетнім дзецям, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення, у зоне з правам на адсяленне і ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем.

Беручы пад ўвагу, што арганізаваны выезд дзяцей, якія пражываюць у зонах радыеактыўнага забруджвання, на лячэнне ў санаторна-курортныя арганізацыі павінен ажыццяўляцца ў суправаджэнні педагагічных работнікаў, указ таксама прадугледжвае аплату праезду педагогаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, выдзеленых на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Золата і нафта першымі б'юць рэкорды

Год толькі пачаўся, а на сусветных рынках — ужо шэраг сюрпрызаў: цэны на золата ўстанавілі новы гістарычны максімум, а кошт нафты ў ходзе таргоў на Нью-Йоркскай біржы ўпершыню падняўся да адзнакі ў 100 долараў за барэль. Праўда, хутка цана на нафту крыху знізілася — да адзнакі 99,15 долара.

Што датычыцца каштоўнага металу, то яшчэ на слыху яго паступовае падаражэнне на працягу ўсяго мінулага года. Нагадаем, што нестабільнасць на сусветных фондавых і валютных рынках у 2007 годзе падхліснула інтарэс да каштоўных металаў як высоканадзейнага інструменту для ўкладання сродкаў. І вось зараз цэны на золата абнавілі гістарычны максімум і дасягнулі 855 долараў за тройскую ўнцыю. Дарэчы, да гэтага часу рэкордная лічылася цана ў 850 долараў, якая была зафіксавана ў студзені 1980 года.

— На старонках «Звязды» мы яшчэ тры гады таму вялі гутарку пра тое, што так будзе, — каментуе сітуацыю **эксперт нашай газеты, дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**. — Я казаў пра тое, што нафта будзе каштаваць 100 долараў, а за еўра будуць даваць 1,5 долара. Усё ідзе да гэтага, а калі падае долар, то людзі ўкладваюць сродкі ў золата — больш няма ў што. 100 долараў за барэль нафты — часовая з'ява, бачна, на гэта паўплывалі чаканні далейшага попыту на нафтапрадукты, а таксама не зусім прыемныя навіны паступаюць з нафтаздабываючых краін. У прыватнасці, нафтатрэйдэры, якія «запусцілі» цану ўверх, улічылі і нестабільную сітуацыю ў Нігерыі, якая з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце вытворцам нафты. Паўтаруся, новая цана — з'ява часовая, аднак у цэлым, на мой погляд, да канца 2008 года нафта сапраўды замацуецца на мяжы кошту каля 100 долараў за барэль, а не 60 долараў, як прагназуе Мінэканомразвіцця Расіі. Кошт золата таксама не павінен моцна адкаціцца. Іншая справа, што на кароткіх адрэзках часу магчымы як рост, так і падзенне цэнаў.

— А гэта значыць, што захоўваць свае сродкі лепш?..

— Калі нафта даражэе, то ўкладвайцеся ў расійскія рублі. У каго больш за ўсё нафты і газу? — У Расіі, таму ў іх усё будзе надзвычай добра.

— Да долара, у якім пераважна копяць людзі, сёлета ў вас, трэба разумець, стаўленне скептычнае?

— І не толькі сёлета, а таксама і ў наступным годзе. Да долара трэба ставіцца асцярожна. Між іншым, у Злучаных Штатах, хутчэй за ўсё, пасля выбараў да ўлады прыйдуць дэмакраты: там, падобна, на выбарах усе шанцы на перамогу мае жонка былога прэзідэнта ЗША Хілары Клінтан. Дэмакраты менш ваююць, а значыць, менш расходуюць грошай на вайну, і пасля іх прыходу да ўлады долар, безумоўна, некалькі ўмацуецца. Аднак гэта будзе часовая з'ява. Дарэчы, думаю, што пасля таго, як адміністрацыя Буша сыдзе, у Беларусі ёсць шанцы палепшыць адносіны з ЗША.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

У ПЕРШУЮ ХВІЛІНУ 2008-ГА

Ужо на першай хвіліне новага, 2008 года, у Гродзенскім абласным клінічным перынатальным цэнтры клапатліва сустрэлі ажно двух нованароджаных!

Жыхарка Гродна Вольга Алясюк нарадзіла хлопчыка, а Ірына Ціток з Бераставіцкага раёна — дзяўчынку. Праходзіць усяго дзве хвіліны і — яшчэ адна дзяўчынка, цяпер у Аксаны Кейко з Мастоў. І гэта, як аказалася, быў толькі пачатак. У той жа дзень нарадзілі хлопчыкаў Аксана Санікевіч з г.п. Краснасельскі Ваўкавыскага раёна, Анжэліка Жылінская і Наталля Кулевіч з абласнога цэнтра, а Аксана Салаўёва з Гродна — дзяўчынку.

Такім чынам, у першы дзень 2008-га ў Гродзенскім перынатальным цэнтры «з лікам 4:3 перамаглі» хлопчыкі. А вось у апошні дзень 2007-га «мацнейшымі» (3:2) аказаліся дзяўчынкі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

За 7—8 гадоў неабходна перасяліць дзяцей-сірот з дамоў-інтэрнатаў у дамы сямейнага тыпу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 снежня, напярэдадні Новага года, наведаў SOS-дзіцячую вёску ў Бараўлянах (Мінскі раён).

У Беларусі 2007 год быў аб'яўлены Годам дзіцяці і стаў пунктам адліку для многіх новых праектаў і праграм, накіраваных на ўмацаванне сям'і, паляпшэнне становішча дзяцей, перш за ўсё сірот. Так, за 10 месяцаў 2007 года мела месца пазітыўная дынаміка ў павелічэнні колькасці дзяцей, якія ўсынаўляюцца беларусамі: у параўнанні з 2006 годам рост склаў 20 працэнтаў. Цяпер у краіне налічваецца амаль 33 тыс. дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У апошнія гады ў рэспубліцы пачала развівацца новая форма работы з дзецьмі-сіротамі: з дамоў-інтэрнатаў іх перасяляюць у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу і так званыя дзіцячыя вёскі.

Абрэвіятура SOS азначае тэрмін «сацыяльная спагада».

Усяго ў рэспубліцы цяпер дзейнічаюць 4 такія сацыяльныя аб'екты: Дзіцячы гарадок Ленінскага раёна ў Мінску і Кобрынская дзіцячая вёска, якія існуюць за кошт падтрымкі дзяржавы, а таксама SOS-дзіцячыя вёскі ў Бараўлянах і ў Мар'інай Горцы, якія спансіруюцца міжнародная дабрачыннай арганізацыяй «SOS-Кіндэрдорф Інтэрнацыяналь».

SOS-дзіцячая вёска ў Бараўлянах — першая з існуючых у Беларусі недзяржаўных дабрачынных грамадскіх арганізацый, заснаваных для выхавання і падрыхтоўкі да самастойнага жыцця дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Яна адкрылася ў жніўні 1995 года, сёння тут у 13 SOS-сем'ях жывуць 72 дзіцяці.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з жыццём гэтага сацыяльнага аб'екта. Прэзідэнт наведаў адну з сем'яў, дзе ў цёплай дамашняй абстаноўцы за кубкам чаю пагутарыў з выхаванцамі, пацікавіўся, наколькі эфектыўная такая работа з дзецьмі-сіротамі, ці не ўшчамляюцца інтарэсы і правы юных грамадзян.

Кіраўнік дзяржавы перадаў у дар выхаванцам новенькі 9-месны мікрааўтобус і пажадаў дзецям поспехаў і здароўя ў надыходзячым годзе.

Затым Прэзідэнт адказаў на пытанні прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ.

Дзялячыся ўражаннямі пасля наведвання дзіцячай вёскі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Я пераканаўся, што мы на правільным шляху».

«Мы разгарнулі вельмі значную праграму, год працуем, але пакуль што яшчэ асабліва не дасягнулі вялікіх поспехаў. Сутнасць праграмы ў тым, каб перасяліць з дамоў-інтэрнатаў усіх дзяцей да сем'яў, у дамы, не абавязкова толькі ў дзіцячыя вёскі. Калі ёсць жадаючыя ў сваю сям'ю ўзяць 5—6 дзяцей, то мы будуем 1—2 дамы ў вёсцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

За 7—8 гадоў неабходна ў маштабах краіны вырашыць праблему дзяцей-сірот і перасяліць іх са звычайных дамоў-інтэрнатаў у сем'і і дзіцячыя вёскі. «Частка сродкаў, якія мы эканомім у выніку ўпарадкавання льгот, мы накіруем на будаўніцтва такіх вёсак і на ўтрыманне дзяцей. Распараджэнне ўжо дадзена», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле ацэнкі Аляксандра Лукашэнкі, Год дзіцяці ў Беларусі прайшоў вельмі паспяхова. «Для мяне было прыемнай навіной пад Новы год: прыкладна за 10 гадоў мы ў 2,5—3 разы павялічылі колькасць усынаўляемых у Беларусі. Гэта значыць нашы дзеці ўсынаўляюцца тут, нашымі людзьмі. Гэта амаль 52 працэнты ад дзяцей-сірот — больш за палавіну. Яшчэ палавіну мы павінны перасяліць з дамоў-інтэрнатаў у дамы, падобныя на дамы ў сацыяльных дзіцячых вёсках», — сказаў Прэзідэнт. За 3—4 гады за мяжу паехалі на ўсынаўленне ўсяго 50 чалавек. Усе яны сёння знаходзяцца на ўліку.

«Да прыняцця адпаведнага рашэння (памятаеце, мяне крытыкавалі, што я «закрыў» для дзяцей выезд за мяжу ў мэтах усынаўлення) амаль 2 тыс. дзяцей адпраўлялі за мяжу. Усе без уліку, ніхто не ведаў: куды, што? Сваіх дзяцей мы павінны выхоўваць і гадаваць самі», — заявіў Прэзідэнт.

Была закранута таксама тэма прадпрымальніцкай дзейнасці. «Прадпрымальнікам трэба займацца канкрэтнай справай. СМІ вельмі правільна ўздымаюць тэму сацыяльнай адказнасці бізнэсменаў, прадпрымальнікаў. Падпісаючы ўказ № 760, я яго сам жа крытыкаваў. Гэта ўказ на іх карысць. Што мы робім? Мы далей прадаўжаем падтрымліваць індывідуальных прадпрымальнікаў, якія завозяць нам з трэціх краін, з Расіі, праз Расію вырспажыў, у асноўным няякасны, і мы іх за гэта яшчэ льгатуем. Гэта значыць, мы для ІП стварылі льготны рэжым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі ты ІП, табе льготы прадастаўлены па падатках (яны значна менш падаткаў плацяць, чым такія ж бізнэсмены і прадпрымальнікі, зарэгістраваныя як прадпрыемствы, як юрыдычныя асобы). А ў нас так: прадпрымальнік наймае па 20, 30, некаторыя сотню чалавек, гэта значыць стварае нармальныя прадпрыемствы і працуе. Ну добра, калі вы хочаце так працаваць, калі ласка, зарэгіструйце сваё прадпрыемства і плаціце ўсе падаткі, — адзначыў Прэзідэнт. — Чаму? Таму што інакш гэта атрымліваецца нядобрасумленная канкурэнцыя. Што ў гэтым дрэннага? Індывідуальна — працуй адзін, вазі, насі, прадавай, вось табе льготы. Ну, у крайнім выпадку — аддушыну далі: можаш узяць сваіх блізкіх сваякоў. Што ў гэтым дрэннага? Нармальна, я лічу. Але я ўсё роўна быў незадаволены гэтым указам. Мы на граніцы (мытныя плацяжы) і па падатках створым абсалютна роўны рэжым. Індывідуальны, калектыўны, дзяржаўны, прыватны, але ты будзеш плаціць падаткі як усе. І тады наймай каго хочаш. Індывідуал ты будзеш, прыватнік — няважна. Але падаткі ўсе будуць плаціць аднолькава. Вось як трэба было зрабіць. Але ім зрабілі аддушыну. Але яны ж хочуць працаваць як цяпер: сотню чалавек наймаючы наёмных работнікаў. Але яшчэ ўсе гэтыя льготы, гэта ўся сітуацыя крыміналізуе эканоміку. Мала таго, што гэта нядобрасумленная канкурэнцыя. Яны прывозяць, напрыклад, адзенне, яны канкурыруюць з нашымі прадпрыемствамі, якія выпускаюць адзенне. А як з імі канкураваць, калі яны падаткі амаль не плацяць? Яны маюць магчымасць цану паніжаць, і яны, дэмпінгуючы, угробілі тысячы рабочых месцаў».

«Многія праз гэтых ІП, якія маюць ільготы, пачалі завозіць тавары для сябе. З'явілася крымінальнае асяроддзе. Але тым не менш мы ім далі аддушыну: добра, некаторы час будзьце, «індывідуалямі», наймайце сваякоў і працуйце па льготах. Не падабаецца — праз год будзеце працаваць у роўных умовах. Адступленне я зрабіў, падпісаўшы ўказ аб прадаўжэнні тэрмінаў перарэгістрацыі ІП у ПУП па спрошчанай схеме. А затым — як усе», — сказаў Прэзідэнт.

Каментуючы па просьбе журналістаў меркаванні аб тым, што за прадастаўлены нядаўна расійскі крэдыт Беларусь будзе разлічвацца высокапрыбытковай дзяржуласнасцю, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта абсалютная бязглуздзіца».

«Нідзе і ніколі не абмяркоўвалася пытанне аб тым, што мы за крэдыт павінны разлічвацца дзяржуласнасцю. Па-першае, гэта вельмі выгадны для нас крэдыт. І мы будзем разлічвацца за гэты крэдыт. Паўтара мільярда долараў — гэта няшмат для нашай дзяржавы. І ніколі расійскі бок нават на экспертным узроўні не ставіў пытанне, каб разлічвацца якой-небудзь уласнасцю — заводамі, фабрыкамі і г.д. Гэтага не будзе ніколі. Мы будзем сумленна, адкрыта і празрыста ісці на продаж нашых прадпрыемстваў і прыватызацыю, як гэта было да гэтага часу», — сказаў Прэзідэнт.

«Некаторыя пагаворваюць аб тым, што амаль ці не суверэнітэт Лукашэнка аддае за гэтыя паўтара мільярда долараў. Уважліва паслухайце маё навагодняе выступленне, вы зразумееце, аб чым ідзе размова. Ні пра якую здачу суверэнітэту, ні пра якое ўваходжанне нашай дзяржавы ў склад іншай дзяржавы размовы быць не можа. Прынамсі, пры прэзідэнцтве Лукашэнкі гэтага не было і быць не можа. Я гавару гэта ўжо 12 гадоў кожны год. Я найбольш зацікаўлены чалавек у тым, каб наша дзяржава была суверэнная і незалежная, пры гэтым мы адбыліся як нацыя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама дадаў, што «крэдыт на каленях у Расіі ніхто не прасіў». «Гэтыя паўтара мільярда, нават два, нам былі абяцаны ў канцы мінулага года пад павышэнне цэнаў на вуглевадародную сыравіну ў гэтым годзе. Дапамаглі — дзякуй, у даўгу не застанёмся», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пераканаваны, што пагроза ЗША ўвесці эканамічныя санкцыі супраць Беларусі не адпужае замежных інвестараў. «Ніякія інвестары не спужаюцца і з Беларусі не пойдуць», — сказаў ён. Як адзначыў Прэзідэнт, напрыклад, сёння кітайцы прапануюць значныя інвестыцыйныя праграмы і гатовы ўкладваць мільярды долараў у нашу краіну.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у выпадку ўвядзення значных эканамічных санкцый з боку ЗША, якія нанясуць вялікі ўрон Беларусі, беларускі бок неадкладна і жорстка адрэагуе на гэта.

«Як толькі будуць уведзены істотныя для нашай эканомікі санкцыі, мы адрэагуем самым жорсткім чынам па ўсіх напрамках: і ў палітыцы, і ў эканоміцы, і па іншых. Як толькі гэта істотна закране нашу эканоміку, то першы, хто адсюль будзе выкінуты, — гэта пасол Злучаных Штатаў Амерыкі. Я гавару аб гэтым публічна. Таму няхай амерыканскі пасол супакоіцца і зоймецца сваімі праблемамі, таму што датэрмінова можа пакінуць сваю пасаду ў Беларусі», — сказаў Прэзідэнт, каментуючы нядаўнюю заяву кіраўніка амерыканскай дыпмісіі аб тым, што эканамічныя санкцыі ў адносінах да Беларусі могуць быць пашыраны.

«Хачу амерыканцаў папярэдзіць першы і апошні раз, што мы вельмі жорстка адрэагуем, і паверце, што яны страцяць свае пазіцыі не толькі ў Беларусі», — дадаў Прэзідэнт.

«Мы выжывем, мы абыдземся без амерыканскага долара. Не падабаецца амерыканцам, што мы працуем з іх валютай — мы адыдзем ад долара. Але пастаянна панукваць нас не атрымаецца. Ці вы бачылі, ім не падабаецца, што мы ў Венесуэле працуем! Калі ласка, няхай прадаставяць нам магчымасць — мы ў Амерыцы будзем працаваць. Мы ідзём туды, дзе нас прымаюць і дзе мы можам атрымаць найбольшы эфект для сваёй эканомікі і ад сваёй прысутнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Пытанне — што мы амерыканцам зрабілі дрэннае? Што мы зрабілі такое амерыканцам, каб яны ўводзілі супраць нас санкцыі? Мы ж у амерыканскія ўнутраныя справы не ўмешваемся, жыць не перашкаджаем, няхай і яны нам не перашкаджаюць, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ім дзесяткі разоў прапаноўвалі: давайце нармальна размаўляць, супрацоўнічаць. Ёсць праблемы — давайце іх вырашаць. Не хочацца! Хочацца падмяць і каваным ботам растаптаць краіну і народ. Гэтага ім я дазволіць не магу».

Гаворачы аб 2008 годзе, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «У мяне толькі адно жаданне: каб пры ўсіх неладах наша эканоміка выстаяла. Як у 2007 годзе, так і ў 2008 годзе. Нам будуць часам падкідваць праблемы, і я вельмі хачу, каб мы з імі справіліся. Я не проста спадзяюся, я перакананы, што так і будзе».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

«НЕ ВЫКЛЮЧАНА ПАЛЯПШЭННЕ АДНОСІНАЎ З ЗША ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ ТАМ НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА»

Улады Беларусі не выключаюць паляпшэння адносінаў з кіраўніцтвам ЗША пасля выбараў прэзідэнта гэтай краіны, якія павінны адбыцца сёлета. Аб гэтым заявіў учора на прэс-канферэнцыі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалай Чаргінец. Паводле яго слоў, дзеючы прэзідэнт ЗША «аказаўся няўдачнікам у дачыненні да міжнароднага супрацоўніцтва. Не толькі з Беларуссю. Вынік гэтага — тысячы забітых і Ірак, які загнаны ў дагістарычныя часы...»

Мікалай Чаргінец таксама дадаў, што кіраўніцтва ЗША «прымае за чыстую манету тое, што гавораць яму апазіцыянеры, якія прыбылі з іншай дзяржавы». «Вельмі дрэнна, што яно адразу верыць на слова. Не перапраўляючы».

Каментуючы апошнія крытычныя выказванні Прэзідэнта Беларусі ў адрас амерыканскіх дыпламатаў у Мінску, парламентарый заявіў журналістам, што, на яго думку, у бліжэйшы час беларускі бок не будзе настойваць на адкліканні пасла ЗША з Беларусі. У той жа час ён адзначыў, што «калі ЗША захочуць гэтага, то могуць дабіцца. Але ўсё гэта залежыць ад іх».

«Пасол ЗША, на жаль, надзвычай цікаўная дама, якая ўлазіць у нашы ўнутраныя справы. З задавальненнем спрабуе, як яна гаворыць, «толькі назіраць» за рознымі пратэстамі, маніфестацыямі». Мікалай Чаргінец выказаў таксама меркаванне, што сёлета прэзідэнты Беларусі і Расіі «прымуць рашэнне па Канстытуцыйным акце» Саюзнай дзяржавы. Аднак адбудзецца гэта не раней, чым пройдуць прэзідэнцкія выбары ў Расіі. Парламентарый дадаў пры гэтым, што кіраўнікі дзяржаў павінны знайсці агульны падыход па двух асноўных пытаннях: аб тым, як будзе ажыццяўляцца кіраванне Саюзнай дзяржавай і аб адзіным эмісійным цэнтры. Ацэньваючы ў цэлым сітуацыю з Саюзнай дзяржавай, парламентарый адзначыў, што гэтая структура «працягвае развівацца». «Галоўнае сведчанне гэтага — тое, што бюджэт Саюзнай дзяржавы за апошнія 7 гадоў павялічыўся ў 10 разоў».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 705

Аб прысуджэнні прэміі «За духоўнае адраджэнне» 2007 года

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры, савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, узгодненыя з кіраўніцтвам Беларускай праваслаўнай царквы, **пастанаўляю**:

1. За актыўную падзвіжніцкую дзейнасць у гуманітарнай галіне, накіраваную на развіццё прагрэсіўных мастацка-маральных традыцый, што садзейнічаюць усталяванню духоўных каштоўнасцяў, ідэй дружбы і братэрства паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, прысудзіць прэмію «За духоўнае адраджэнне» 2007 года (далей — прэмія):

архіепіскапу Віцебскаму і Аршанскаму Дзімітрыю (Драздову Мікалаю Рыгоравічу) — кіраўніку мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Віцебская епархія Беларускай праваслаўнай царквы»;

Круцялёву Андрэю Іванавічу — протаіерэю, настаяцелю рэлігійнай абшчыны «Прыход храма Святой Жываначальнай Троіцы в. Бараўляны Мінскага раёна Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы»;

калектыву дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль».

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асобаў.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

31 снежня 2007 г., г. Мінск.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 706

Аб прысуджэнні спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2007 года

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры і савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, **пастанаўляю**:

1. За значныя вынікі ў творчай, культурна-асветніцкай, педагагічнай дзейнасці, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2007 года (далей — прэміі) у наступных намінацыях:

музычнае мастацтва

творчаму калектыву дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы Рэспублікі Беларусь» — за стварэнне канцэртнага праекта «Шэдэўры сусветнага мастацтва ля сцен Старажытнай Сафіі»;

выяўленчае мастацтва

Апіоку Мікалаю Афанасьевічу, кіраўніку студыі ваенных мастакоў дзяржаўнай культурна-дасугавай установы «Цэнтральны Дом афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», — за стварэнне трыпціха «Шчыт Айчыны-2004» і іншых жывапісных твораў патрыятычнай тэматыкі, значны ўклад у эстэтычнае выхаванне насельніцтва;

журналістыка

Падаляк Таццяне Уладзіміраўне, рэдактару аддзела культуры ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда», — за цыкл публікацый «Нашчадкі вогненных вёсак»;

радыё і тэлебачанне

аўтарскаму калектыву закрытага акцыянернага таварыства «Сталічнае тэлебачанне» ў складзе Арабчык Марыі Іванаўны, загадчыка службы вяшчання на Мінскую вобласць дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Галанскага Аляксандра Алегавіча, спецыяльнага карэспандэнта дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Забеліч Вольгі Мікалаеўны, спецыяльнага карэспандэнта дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Кавалёвай Людмілы Генадзьеўны, намесніка генеральнага дырэктара, Марцьянавай Ірыны Аляксандраўны, спецыяльнага карэспандэнта дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Мітрукевіча Дзмітрыя Яўгенавіча, загадчыка службы рэжысёраў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Пазняка Ігара Аляксеевіча, палітычнага аглядальніка дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, Сцепанюка Алега Мікалаевіча, спецыяльнага карэспандэнта другой катэгорыі дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, — за падрыхтоўку і правядзенне тэлевізійнай акцыі «Час дзяцінСТВа»;

народная творчасць

Гарадоцкаму Дору рамёствуў і фальклору Віцебскай вобласці — за значны ўклад у захаванне і развіццё традыцыйных рамёстваў;

харэаграфічнае мастацтва

Борчанка Кацярыне Генадзьеўне, артыстцы балета, вядучаму майстру сцэны дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установы «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь», — за яркія сцэнічныя вобразы ў спектаклях тэатральнага сезона 2006/2007 года;

музейная справа

аўтарскаму калектыву ўстановы «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь» у складзе Баслыка Сяргея Канстанцінавіча, намесніка дырэктара па навукова-фондавай рабоце і рэстаўрацыі, Вайцэхоўскай Валянціны Уладзіміраўны, загадчыка аддзела сучаснага беларускага мастацтва, Карпенка Алены Уладзіленаўны, загадчыка аддзела старажытнабеларускага мастацтва, Пракапцова Уладзіміра Іванавіча, дырэктара, Рэзнік Таццяны Абрамаўны, загадчыка аддзела рускага мастацтва, Сенькевіч Алены Уладзіміраўны, загадчыка аддзела замежнага мастацтва, Усавай Надзеі Міхайлаўны, намесніка дырэктара па навуковай рабоце, Чайкоўскай Алы Васільеўны, галоўнага захавальніка, — за стварэнне новых экспазіцый і арганізацыю міжнародных выставак;

калектыву ўстановы культуры «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей» — за распрацоўку і ўкараненне музейна-адукацыйнай праграмы «Гроднаznайства»;

бібліятэчная справа

Чэрновай Тамары Паўлаўне, дырэктару сеткі публічных бібліятэк г.Жодзіна Мінскай вобласці, — за ўкараненне новых тэхналогій бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва;

аматарская мастацкая творчасць

узорнаму ансамблю эстраднага танца «Гарэзлівыя агеньчыкі» Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў транспартнага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» — за плённую працу па эстэтычнаму выхаванню падрастаючага пакалення і актыўную канцэртную дзейнасць;

выхаванне творчай моладзі

Брэсцкай дзіцячай музычнай школе № 1 — за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, падрыхтоўку лаўрэатаў міжнародных конкурсаў;

развіццё міжнародных культурных сувязяў

Лучанку Ігару Міхайлавічу, старшыні грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў», народнаму артысту СССР, — за плённую працу па прапагандзе беларускага музычнага мастацтва за мяжой і развіццю міжнародных культурных сувязяў.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асобаў.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

31 снежня 2007 г., г. Мінск.

Віншуем нашу калегу Таццяну ПАДАЛЯК з высокай дзяржаўнай адзнакай!

Звяздоўцы.

У суд Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак грамадзяніна **ДАВЫДОВІЧА Сяргея Мікалаевіча**, 5 жніўня 1978 года нараджэння, ураджэнца г. Капыля Мінскай вобласці, які пражываў па адрасе: г. Маладзечна, вул. Ф. Скарыны, д. 6, кв. 26 і быў прапісаны ў г. Капыль, вул. Энгельса, д. 49. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра С.М. Давыдовіча, паведаміць іх суду Маладзечанскага раёна па адрасе: г. Маладзечна, вул. Партызанская, 5 або па тэл. 70 862 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Считать недействительным страховой полис по обязательному **страхованию ГО владельцев транспортных средств** на территории РБ серии АД № 2011755 СООО «Белкоопстрах».

НІХТО НІКУДЫ НЕ ЕДЗЕ?

У навагоднюю ноч у Кароўчыне Дрыбінскага раёна каля дзвюх гадзін 1 студзеня на вясковай вуліцы начальнік Дрыбінскай ДАІ разам з інспектарам спынілі аўтамабіль «Опель», за рулём якога знаходзіўся малады чалавек. Вадзіцель выглядаў п'яным, яго трэба было адпраўляць на медагляд. Аднак у час разбору пасажыр з аўтамабіля, 48-гадовы мужчына, вынес з хаты карабін часоў Другой сусветнай вайны, накіраваў яго на супрацоўнікаў міліцыі і паабяцаў страляць: маўляў, ніхто нікуды не паедзе. Хуліганаў скруцілі і затрымалі, а карабін адабралі.

Ілона ІВАНОВА.

На слыху

ВЫПАЛА З 9-ГА ПАВЕРХА ДОМА...

Раніцай у сераду 35-гадовая жыхарка сталіцы па неасцярожнасці выпала з агульнага балкона 9-га паверха аднаго з дамоў па праспекце газеты «Звязда».

Як удакладняюць у аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне зафіксавана каля 10 гадзін раніцы, а яго ахвярай стала медсястра адной з бальніц Мінска, якая пражывала ў гэтым доме. Жанчына загінула на месцы здарэння ад атрыманых цялесных пашкоджанняў.

Ігар ГРЫШЫН.

«СПІРТОВА-ГАРЭЛАЧНЫ» ГАРАЖ

Брэсцкія памежнікі сумесна з праваахоўнікамі канфіскавалі буйную партыю спіртных напояў.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранкамітэта, грамадзянін Беларусі нелегальна ўвёз больш за 500 літраў украінскай гарэлкі і 90 літраў спірту. Кантрабандыста затрымалі ўжо на тэрыторыі нашай краіны, калі ён выгружаў у гаражы гарэлку і спірт.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МАБІЛЬНЫ ЗЛАДЗЮЖКА

У Чэрвені ноччу невядомы прабраўся ў салон сотавай сувязі, адкуль выкраў 20 мабільных тэлефонаў.

Паводле інфармацыі прэс-службы УУС Мінаблвыканкама, злачынца дабраўся да здабычы, узламаўшы замкі дзвярэй. Між іншым, кошт зніклага тавару ацэньваецца ў суму 6 мільёнаў 718 тысяч рублёў. Праваахоўнікі ўжо затрымалі падазронага ў гэтым злачынстве, якім аказаўся 18-гадовы навучэнец ПТВ: хлопец змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Дарэчы, па месцы яго жыхарства знойдзена і канфіскавана 16 мабільнікаў.

Ігар ГРЫШЫН.

ВЫБАР ЁСЦЬ

На прылаўках магазінаў Брэстчыны з'явілася «Савецкае шампанскае» па цане больш за 14 тысяч. Што, кошт шампанскага вырас удвая?

Аказалася, што віно выраблена ў Адэсе, а на выпушчанае Мінскім заводам цана не падняласа. Праўда, беларускае шампанскае не ва ўсіх магазінах ёсць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«СКУРАНЫ» РЭЙС

Гомельскія памежнікі затрымалі ў Лельчыцкім раёне інтэрнацыянальны «дуэт» кантрабандыстаў.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, грамадзяне Беларусі і Украіны спрабавалі «падпольнымі дарогамі» незаконна ўвезці ў нашу краіну амаль 800 кілаграмаў скур буйной рагатай жывёлы, 25 кілаграмаў ялавічных языкоў і партыю петардаў. Агульны кошт кантрабандных тавараў склаў больш за 2 мільёны рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Авіярука ўрада Масквы дацягнулася да Мінска

Падрабязнасці

І адбылося гэта якраз напярэдадні Новага года. Бразільскі самалёт Эмбраер-120 маскоўскай авіякампаніі «Атлант-Союз» выканаў першы рэйс з міжнароднага аэрапорта «Унукава» ў беларускую сталіцу. З гэтай нагоды ў аэрапорце «Мінск-1» прайшла прэзентацыя «Атлант-Союза», яе планаў у Беларусі і, зразумела, Эмбраера-120, на якім нам прапаноўваецца лятаць.

Сімвалічна, што палётам у беларускую сталіцу быў дадзены старт рэалізацыі амбіцыйнай маскоўскай гарадской праграмы адраджэння рэгіянальных перавозак на 30 мясцовых самалётах тыпу Эмбраер-120. Сёлета кампанія плануе пачаць палёты ў Гродна і Брэст, яшчэ прыкладна ў 30 гарадоў Расіі і блізкага замежжа. У прыватнасці, Вільнюс і Талін. Відаць, што для большасці еўрапейскіх краін разумеецца як міжнародны рэйс, то для Масквы — рэгіянальны. Які яшчэ сталічны муніцыпалітэт мае ўласную авіякампанію? Я, напрыклад, аналага не знайшоў.

А ўрад Масквы, калі меркаваць па змесце прэзентацыі, поўны рашучасці заняць рэгіянальную нішу перавозак на постсавецкай прасторы. У буйнамаштабную мадэрнізацыю аэрапорта «Унукава» мяркуецца ўкласці сотні мільёнаў долараў ЗША. У прыватнасці, сёлета 7 лістапада роўна ў 14.00 (так вырашыў мэр Юрый Лужкоў) урачыста адкрыецца новы пасажырскі тэрмінал плош

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАПАМОГАХ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 снежня 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1992 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2002 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 27, ст. 473; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 35, 2/843; 2005 г., № 196, 2/1166; 2006 г., № 78, 2/1207; № 186, 2/1273) змяненні і дапаўненні, выклаўшы іх у новай рэдакцыі:

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Права на дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей

Права на дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей (далей — дзяржаўныя дапамогі), у выпадках, вызначаных гэтым Законам, маюць сем'і грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, што пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржаўныя дапамогі, прадугледжаныя гэтым Законам, не прызначаюцца на дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзіцячых інтэрнатных установах (у тым ліку перададзеных на патранатнае выхаванне), дзяржаўных спецыялізаваных установах для непаўналетніх, якія маюць патрэбу ў дапамозе і рэабілітацыі, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, дзіцячых вёсках (гарадках), прыёмных сем'ях.

На дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні і выхоўваюцца ў апякунскіх сем'ях, прадугледжаныя гэтым Законам дзяржаўныя дапамогі не прызначаюцца, за выключэннем дапамог, прадугледжаных артыкуламі 8, 9, 12, 18 і 20—22 гэтага Закона.

Артыкул 2. Віды дзяржаўных дапамог

У адпаведнасці з гэтым Законам назначаюцца дзяржаўныя дапамогі:

па цяжарнасці і родах;

у сувязі з нараджэннем дзіцяці;

жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці;

па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў;

на дзяцей, якім больш за 3 гады;

па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў;

па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці;

па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў;

пры санаторна-курортным лячэнні дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў;

на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека.

Артыкул 3. Надбаўкі да дзяржаўных дапамог

Да дзяржаўных дапамог, указаных у абзацах пятым і шостым артыкула 2 гэтага Закона, устанаўліваюцца надбаўкі на:

дзяцей народжаных жанчынамі не ў шлюбе, калі зместкі пра бацьку дзіцяці ў кнізе рэгістрацыі актаў аб нараджэнні зроблены паводле ўказання маці;

дзяцей, усыноўленых (удачараных) адзінокімі асобамі;

дзяцей, што выхоўваюцца адным з бацькоў, якія скасавалі шлюб і не ўступілі ў новы шлюб, у выпадках, калі адзін з бацькоў ухіляецца ад выплаты аліментаў, дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай або папячыцельствам, у выпадках, калі бацькі ўхіляюцца ад выплаты аліментаў, у іншых выпадках, прадугледжаных часткай другой артыкула 24 гэтага Закона, калі спагнанне аліментаў немагчымае;

дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, якія выхоўваюцца ў сям'і;

дзяцей ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, дзяцей курсантаў ваенных навучальных устаноў, навучальных устаноў органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, за выключэннем курсантаў, з якімі заключаны кантракт аб праходжанні ваеннай службы (далей — дзеці курсантаў устаноў адукацыі), дзяцей ваеннаабавязаных, якія закліканы на ваенныя або спецыялізаваныя зборы, дзяцей рэзервістаў на час праходжання імі заняткаў і вучэбных зборaў.

Пры наяўнасці права на надбаўку да дзяржаўных дапамог па некалькіх падставах надбаўка ўстанаўліваецца па адной з падстаў па выбары атрымальніка.

Артыкул 4. Сродкі на выплату дзяржаўных дапамог і надбавак да іх, кантроль за іх мэтавым выкарыстаннем

Выплата дзяржаўных дапамог і надбавак да іх ажыццяўляецца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і рэспубліканскага бюджэту.

Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў на выплату дзяржаўных дапамог і надбавак да іх ажыццяўляецца Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

ГЛАВА 2
ДАПАМОГА ПА ЦЯЖАРНАСЦІ І РОДАХ

Артыкул 5. Права на дапамогу па цяжарнасці і родах

Права на дапамогу па цяжарнасці і родах маюць жанчыны, занятыя дзейнасцю, у перыяд ажыццяўлення якой на іх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне.

Права на дапамогу па цяжарнасці і родах маюць таксама жанчыны:

з ліку ваеннаслужачых, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь;

якія навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля заканчэння ВНУ, а таксама тыя, што скончылі гэтыя ўстановы адукацыі, — на працягу 2 месяцаў пасля іх заканчэння;

зарэгістраваныя ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей — органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне) у якасці беспрацоўных або якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі па накіраванні гэтых органаў.

Жанчыны, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў, маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах на агульных падставах.

Жанчыны, якія навучаюцца на дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, і сумяшчаюць вучобу з працай, маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах па месцы вучобы і па месцы працы.

Парадак забеспячэння дапамогай па цяжарнасці і родах устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Памер дапамогі па цяжарнасці і родах

Дапамога па цяжарнасці і родах назначаецца:

жанчынам, якія працуюць на падставе працоўных дагавораў або членства (удзелу) у арганізацыях любых арганізацыйна-прававых формаў, — у памеры 100 працэнтаў сярэднядзённага (сярэднегадзіннага) заробку, але за кожны каляндарны месяц не больш за трохразовую велічыню сярэдняй заработнай платы рабочых і служачых у рэспубліцы ў месяц, які папярэднічае кожнаму месяцу водпуску па цяжарнасці і родах, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам — індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, членам сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, творчым работнікам, а таксама жанчынам, якія ажыццяўляюць прадугледжаныя заканадаўчымі актамі віды рамеснай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, — у памеры 100 працэнтаў сярэднядзённага даходу (заробку), але не больш за 70 працэнтаў сумы абавязковых страхавых узносаў, заплачаных за перыяд, за які налічваецца сярэднядзённы даход (заробак), і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія выконваюць работы па грамадзянска-прававому дагавору, прадметам якога з'яўляецца аказанне паслуг, выкананне работ і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, — у памеры 100 працэнтаў сярэднядзённага ўзнагароджання паводле ўказанага дагавора, але не больш за 70 працэнтаў сумы абавязковых страхавых узносаў, выплачаных з узнагароджання, з якога вылічвалася дапамога, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам з ліку ваеннаслужачых, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь — у памеры 100 працэнтаў грашовага забеспячэння, але за кожны каляндарны месяц не больш за трохразовую велічыню сярэдняй заработнай платы рабочых і служачых у рэспубліцы ў месяц, які папярэднічае кожнаму месяцу водпуску па цяжарнасці і родах, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія навучаюцца ў дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля заканчэння ВНУ, — у памеры стыпендыі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах, а тым, хто не атрымлівае стыпендыю, — у мінімальным памеры дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, зарэгістраваным у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных, — у памеры дапамогі па беспрацоўі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, — у памеры стыпендыі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія выйшлі на працу на ўмовах, што прадугледжваюць іх занятасць на працягу больш як паловы месячнай нормы рабочага часу;

пры афармленні дзіцяці ва ўстанову, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі.

Калі ў перыяд атрымання дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў узнікае права на дапамогу па цяжарнасці і родах, дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў за перыяд атрымання дапамогі па цяжарнасці і родах выплачваецца ў памерах, прадугледжаных гэтым артыкулам.

Асобы, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і адначасова працягваюць атрыманне адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і адукацыі пасля заканчэння ВНУ, — у памеры стыпендыі за кожны каляндарны месяц, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах, а тым, хто не атрымлівае стыпендыю, — у мінімальным памеры дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, — у памеры 100 працэнтаў сярэднямесячнага грашовага забеспячэння, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах у месяц устанаўліваецца ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь за два апошнія кварталы (далей — найбольшая велічыня бюджэту пражыткovага мінімуму), адносна кожнага месяца водпуску па цяжарнасці і родах.

Артыкул 7. Перыяд выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах

Дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца адначасова за перыяд з 30 тыдняў цяжарнасці працягласцю 126 каляндарных дзён. Жанчынам, якія пражываюць (працуюць) на тэрыторыі з радыеактыўным забруджваннем 1 Ku/кв.км і вышэй, дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца за перыяд з 27 тыдняў цяжарнасці працягласцю 146 каляндарных дзён.

У выпадку ўскладненых родаў або нараджэння дваіх і больш дзяцей дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца за перыяд працягласцю 140 каляндарных дзён, а жанчынам, якія пражываюць (працуюць) на тэрыторыі з радыеактыўным забруджваннем 1 Ku/кв.км і вышэй, — за 160 каляндарных дзён.

У выпадку родаў, якія наступілі да 30 тыдняў цяжарнасці (да 27 тыдняў цяжарнасці ў жанчын, якія пражываюць (працуюць) на тэрыторыі з радыеактыўным забруджваннем 1 Ku/кв.км і вышэй), дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца за перыяд, указаны ў частках першай і другой гэтага артыкула, а ў выпадку нараджэння мёртвага дзіцяці — за 70 каляндарных дзён.

Артыкул 8. Права на дапамогу па цяжарнасці і родах асобаў, якія ўсынавілі (удачарылі) дзіця або назначаных яго апекунамі

Асобы, якія ўсынавілі (удачарылі) дзіця ва ўзросце да 3 месяцаў або прызначаныя яго апекунамі, маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах, якая выплачваецца за перыяд працягласцю 70 каляндарных дзён з дня ўсынаўлення (удачарэння) або ўстанаўлення апекі.

ГЛАВА 3
ДАПАМОГА Ў СУВЯЗІ З НАРАДЖЭННЕМ ДЗІЦЯЦІ, ДАПАМОГА ЖАНЧЫНАМ, ЯКІЯ СТАЛІ НА ЎЛІК У ДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ДА 12-ТЫДНЁВАГА ТЭРМІНУ ЦЯЖАРНАСЦІ

Артыкул 9. Права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці

Права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці маюць маці або бацька, а таксама асобы, якія ўсынавілі (удачарылі) дзіця ва ўзросце да 6 месяцаў або прызначаныя яго апекунамі.

Артыкул 10. Памер дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці

Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці назначаецца і выплачваецца аднаразова:

пры нараджэнні першага дзіцяці — у памеры пяцідзесяцікратнай найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці;

пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — у памеры сямікратнай найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці.

У выпадку нараджэння, усынаўлення (удачарэння) дваіх і больш дзяцей, устанаўлення апекі над двума і больш дзецьмі дапамога прызначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця ў памерах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула.

Пры вызначэнні памеру дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці не ўлічваюцца дзеці, у дачыненні да якіх маці пазбаўлена бацькоўскіх правоў.

Артыкул 11. Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці

Права на дапамогу маюць жанчыны, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, рэгулярна наведвалі іх і выконвалі прадпісанні ўрачоў на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці.

Дапамога назначаецца і выплачваецца аднаразова ў памеры найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму перад датай нараджэння дзіцяці.

ГЛАВА 4
ДАПАМОГА ПА ДОГЛЯДЗЕ ДЗІЦЯЦІ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 3 ГАДОЎ

Артыкул 12. Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў маюць маці або бацька, усынавіцель (удачарыцель), апякун дзіцяці, якія фактычна ажыццяўляюць іх догляд. Члены сям'і або іншыя сваякі дзіцяці маюць права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у выпадку знаходжання іх у водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

Артыкул 13. Памер і ўмовы выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца ў памеры 80 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму.

Асобам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і працуюць на ўмовах няпоўнага працоўнага часу (не больш за палову месячнай нормы) або на даму, дапамога прызначаецца ў памеры, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула.

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у памеры 50 працэнтаў дапамогі, прадугледжанай часткай першай гэтага артыкула, прызначаецца (выплачваецца):

асобам, якія выйшлі на працу на ўмовах, што прадугледжваюць іх занятасць на працягу больш як паловы месячнай нормы рабочага часу;

пры афармленні дзіцяці ва ўстанову, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі.

Калі ў перыяд атрымання дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў узнікае права на дапамогу па цяжарнасці і родах, дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў за перыяд атрымання дапамогі па цяжарнасці і родах выплачваецца ў памерах, прадугледжаных гэтым артыкулам.

Асобы, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і адначасова працуюць ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі ці вышэйшай адукацыі, маюць права на дапамогу ў памерах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, незалежна ад атрымання стыпендыі.

Артыкул 14. Перыяд выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў выплачваецца штомесяц з дня ўзнікнення права на гэту дапамогу ў адпаведнасці з артыкуламі 28 гэтага Закона па дзень дасягнення дзіцем узросту 3 гадоў.

ГЛАВА 5
ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ, ЯКІМ БОЛЬШ ЗА 3 ГАДЫ

Артыкул 15. Права на дапамогу на дзяцей старэйшых за 3 гады

Права на дапамогу на дзяцей, якім больш за 3 гады, маюць бацькі:

якія працуюць па працоўным дагаворы, грамадзянска-прававым дагаворы, прадметам якога з'яўляюцца аказанне паслуг, выкананне работ і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

з ліку ваеннаслужачых, асобаў радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь;

якія ажыццяўляюць прадугледжаныя заканадаўчымі актамі віды рамеснай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, індывідуальныя прадпрымальнікі, члены сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, творчыя работнікі, прыватныя натарыусы пры ўмове выплаты абавязковых страхавых узносаў на сацыяльнае страхаванне ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны;

свяшчэннаслужыцелі, асобы, якія працуюць у рэлігійных арганізацыях;

якія навучаюцца ў дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і адукацыі пасля заканчэння ВНУ;

якія зарэгістраваны ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных або якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі па накіраванні дадзеных органаў;

якія атрымліваюць пенсіі, дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідам I і II групы, асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Дапамога на дзяцей, якім больш за 3 гады, не прызначаецца, калі на момант звароту па дапамогу працаздольныя бацька або маці ў няпоўнай сям'і або працаздольны бацька ў поўнай сям'і не працуюць і не маюць іншага віду занятасці, указанага ў частцы першай гэтага артыкула. Дапамога таксама не прызначаецца, калі ў годзе, які папярэднічаў году звароту па дапамогу, працаздольныя бацька або маці ў няпоўнай сям'і або працаздольны бацька ў поўнай сям'і не працавалі і не мелі іншага віду занятасці, указанага ў частцы першай гэтага артыкула, больш як 6 месяцаў (атрымлівалі дапамогу па беспрацоўі менш як 26 каляндарных тыдняў).

Сем'ям, якія прыбылі ў Рэспубліку Беларусь на пастаяннае месца жыхарства з іншых дзяржаў, дапамогі на дзяцей, якім больш за 3 гады, прызначаюцца пры ўмове, што працаздольныя бацька або маці ў няпоўнай сям'і або працаздольны бацька ў поўнай сям'і адпрацавалі ў Рэспубліцы Беларусь у годзе, які папярэднічаў году звароту па дапамогу, не менш за 6 месяцаў, а таксама працуюць або маюць іншы від занятасці, указаны ў частцы першай гэтага артыкула, на момант звароту па дапамогу, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі.

Умовы, якія прадугледжаны часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, не распаўсюджваюцца на бацькоў, якім устаноўлена інваліднасць, прызначаны пенсія ў сувязі са стратай кармільца або дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідам I групы, асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Сем'і не маюць права на дапамогу на дзяцей, якім больш за 3 гады, калі адзін з бацькоў не працуе і не мае іншага віду занятасці, указанага ў частцы першай гэтага артыкула, а другі працуе за межамі Рэспублікі Беларусь або абодва бацькі працуюць за межамі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем асобаў, якія працуюць у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі.

Артыкул 16. Памер і ўмовы выплаты дапамогі на дзяцей, якім больш за 3 гады

Дапамога на дзяцей, якім больш за 3 гады, прызначаецца ў памеры 30 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму.

Дапамога прызначаецца на кожнае дзіця і выплачваецца:

у памеры, прадугледжаным часткай першай гэтага артыкула, пры ўмове, што сярэдні сукупны даход на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 60 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня папярэдняга года;

у памеры 50 працэнтаў дапамогі, прадугледжанай часткай першай гэтага артыкула, пры ўмове, што сярэдні сукупны даход на члена сям'і ў месяц за папярэдні каляндарны год не перавышае 80 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ў цэнах верасня папярэдняга года.

Парадак падліку сукупнага даходу на члена сям'і пры прызначэнні дапамогі на дзяцей, якім больш за 3 гады, вызначаецца Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, дзіця, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, ва ўзросце да 18 гадоў, няпоўным сем'ям, у якіх бацькі або маці ўстаноўлена I або II група інваліднасці, пры ўмове, што ён не працуе і не мае іншага віду занятасці, указанага ў частцы першай артыкула 15 гэтага Закона, а таксама сем'ям ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, дапамога на ўсіх дзяцей у сям'і прызначаецца і выплачваецца ў памерах, прадугледжаных часткай першай гэтага артыкула, незалежна ад сукупнага даходу на члена сям'і.

Артыкул 17. Перыяд выплаты дапамогі на дзяцей, якім больш за 3 гады

Дапамога на дзяцей, якім больш за 3 гады, прызначаецца з дня ўзнікнення права на гэту дапамогу ў адпаведнасці з артыкулам 28 гэтага Закона і выплачваецца штомесяц на:

дзяцей, якія не навучаюцца ва ўстановах адукацыі і не працуюць, — па дзень дасягнення імі ўзросту 16 гадоў;

вучняў агульнаадукацыйных устаноў, за выключэннем выпадкаў, якія прадугледжаны абзацам чацвёртым гэтага артыкула, — да заканчэння навучання (па ліпень уключна);

вучняў вячэрніх (зменных) школ, якія адначасова з вучобай у школе атрымліваюць прафесію і не працуюць, — па дзень дасягнення імі ўзросту 18 гадоў;

навучэнцаў, якія навучаюцца за кошт уласных сродкаў ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, — па дзень дасягнення імі ўзросту 18 гадоў;

дзяцей, якія атрымліваюць прафесійную падрыхтоўку за кошт уласных сродкаў, — па дзень дасягнення імі ўзросту 18 гадоў;

дзяцей-інвалідаў, якія не навучаюцца ва ўстановах адукацыі і не працуюць, — па дзень дасягнення імі ўзросту 18 гадоў.

ГЛАВА 6
ДАПАМОГІ ПА ДОГЛЯДЗЕ ХВОРАГА ДЗІЦЯЦІ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 14 ГАДОЎ, ДЗІЦЯЦІ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 3 ГАДОЎ І ДЗІЦЯЦІ-ІНВАЛІДА ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГАДОЎ У ВЫПАДКУ ХВАРОБЫ МАЦІ АБО ІНШАЙ АСОБЫ, ЯКАЯ ФАКТЫЧНА АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ ДОГЛЯД ДЗІЦЯЦІ, ДЗІЦЯЦІ-ІНВАЛІДА ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГАДОЎ, ПРЫ САНАТОРНА-КУРОРТНЫМ ЛЯЧЭННІ ДЗІЦЯЦІ-ІНВАЛІДА ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГАДОЎ, А ТАКСАМА ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА 18 ГАДОЎ, ІНФІЦЫРАВАНЫХ ВІРУСАМ ІМУНАДЭФІЦЫТУ ЧАЛАВЕКА

Артыкул 18. Права на дапамогу па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў, дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці

Права на дапамогу па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў, дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці, маюць маці, бацька, усынавіцель (удачарыцель), апякун, папячыцель або іншая асоба, якая непасрэдна ажыццяўляе догляд дзіцяці, на якіх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за якіх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне.

Артыкул 19. Перыяд і ўмовы выплаты дапамог па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў, дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці

Дапамога па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў пры амбулаторным лячэнні выплачваецца за перыяд, на працягу якога дзіцяці згодна з заключэннем урача мае патрэбу ў доглядзе, але не больш чым 14 каляндарных дзён.

Пры стацыянарным лячэнні дзіцяці на ўзросце да 5 гадоў асобам, указаным у артыкуле 18 гэтага Закона, прадастаўляецца магчымасць знаходзіцца з ім у арганізацыі аховы здароўя з выплатай дапамогі па доглядзе хворага дзіцяці за ўвесь перыяд стацыянарнага лячэння. Пры стацыянарным лячэнні дзіцяці ва ўзросце ад 5 да 14 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, якія маюць патрэбу згодна з заключэннем урачоў у дадатковым доглядзе, асобам, указаным у артыкуле 18 гэтага Закона, прадастаўляецца магчымасць знаходзіцца ў арганізацыі аховы здароўя з выплатай дапамогі па доглядзе хворага дзіцяці за ўвесь перыяд, на працягу якога яно мае патрэбу ў доглядзе.

Асобам, указаным у артыкуле 18 гэтага Закона, у перыяд знаходжання ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў дапамога па доглядзе хворага дзіцяці не выплачваецца, акрамя тых, хто працуе ў перыяд указанага водпуску.

Дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці, выплачваюцца за ўвесь перыяд, калі згодна з заключэннем урачоў указаныя асобы не могуць ажыццяўляць догляд дзіцяці.

Дапамогі па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў, дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці, прызначаюцца і выплачваюцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 20. Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў

Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў маюць маці, бацька, апякун, папячыцель або іншая асоба, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці-інваліда, калі яны не працуюць і не атрымліваюць пенсіі. Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў маюць таксама маці або бацька, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда прызначаецца на кожнае дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і выплачваецца штомесяц у памеры 65 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму. Пры гэтым дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда прызначаецца незалежна ад устаноўленай дзіцяці ступені страты здароўя.

Артыкул 21. Дапамога пры санаторна-курортным лячэнні дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў

Пры санаторна-курортным лячэнні дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў аднаму з працуючых бацькоў, усынавіцелю (удачарыцелю), апекуну, папячыцелю, у сям'і якіх выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў, выплачваецца дапамога на ўвесь перыяд санаторна-курортнага лячэння (з улікам часу на праезд туды і назад).

Парадак забеспячэння і памер дапамогі пры санаторна-курортным лячэнні дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 22. Дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека

Права на дапамогу маюць сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваныя вірусам імунадэфіцыту чалавека.

Дапамога прызначаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, і выплачваецца штомесяц у памеры 45 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткovага мінімуму.

Дапамога на дзяцей, якая прадугледжана гэтым артыкулам, прызначаецца незалежна ад атрымання на іх іншых відаў дзяржаўных дапамог і пенсій.

ГЛАВА 7
НАДБАЎКІ ДА ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАПАМОГ

Артыкул 23. Надбаўка да дзяржаўных дапамог на дзяцей, якія народжаны жанчынамі па-за шлюбам, калі зместкі аб бацьку дзіцяці ў кнізе рэгістрацыі актаў аб нараджэнні зроблены па ўказанні маці, дзяцей, усыноўленых (удачараных) адзінокімі асобамі

На дзяцей, якія народжаны жанчынамі па-за шлюбам, калі зместкі аб бацьку дзіцяці ў кнізе рэгістрацыі актаў аб нараджэнні зроблены па ўказанні маці, дзяцей, усыноўленых (удачараных) адзінокімі асобамі, прызначаецца і выплачваецца штомесячная надбаўка да дзяржаўнай дапамогі, указанай у абзацы пятым артыкула 2 гэтага Закона, на кожнае дзіця ў памеры 75 працэнтаў дапамогі да спаўнення дзіцяці паўтара года і ў памеры 40 працэнтаў на дзіця

ПАЭТЫ, ЯКІЯ ЎЗВАРУХНУЛІ СВЕТ

Гэта адбылося аднойчы пры змене стагоддзяў. Дваццатае сыходзіла і пакідала загадкі таленту вялікіх лірыкаў, імёны якіх хацелася б перанесці ў будучыню. І тады з'явілася публікацыя ў «Маладосці», якая ўзварухнула грамадскасць, прымушаючы разважаць пра паэзію. Але найперш — чытаць яе. І пагаджацца ці не з думкамі аўтара Віктара Яраца, які прапанаваў свой спіс з імёнамі 100 беларускіх паэтаў XX стагоддзя.

Прайшло сем гадоў пасля той гучнай публікацыі 2001 года. І вось на пачатку надыходзячага года часопіс «Маладосць» вяртаецца да гэтай тэмы. Прынамсі, у першым нумары нам прапануюць далучыцца да разважанняў аўтара той самай нашумелай анталогіі наконт магчымых змен на паэтычным алімпе паводле меркавання Віктара Яраца. «Звязда» не магла абысці ўвагай будучую публікацыю, асабліва таму, што нашы чытачы вельмі актыўна адрэагавалі на само з'яўленне гэтай анталогіі. Аўтар зацікаўлена сачыў за водгукамі ў прэсе і прыватнасці ў «Звяздзе», сам далучыўся да размовы, пра што прыгадвае ў сваім чарговым артыкуле ў «Маладосці», дзе разам з тым друкуецца апошняя версія яго анталогіі. У тым, чаму часопіс вырашыў вярнуцца да гэтай тэмы, нам дапаможа разабрацца сёння паэтка Раіса БАРАВІКОВА, рэдактар «Маладосці».



— Добрая прыкмета, свежы снег у ранні, патрымай сняжынку, загадай жаданне, — некалі з гарзы жартаваў дзядуля, а сняжынкі падалі і мяне не чулі... Знік той снежны ранак ў далечы далёкай, новы снег прынеслі новыя аблокі, з новымі жаданнямі новы дзень вітаю, а на скронях снег ляжыць — болей не знікае.

У артыкуле Віктар Рац нагадвае тлумачэнні, якія давялося яму даваць з нагоды публікацыі першай анталогіі: «Мэта публікацыі была, акрамя ўсяго іншага, і ў тым (адна з галоўных), каб «разварушыць літаратурна-крытычны вулей, абудзіць цікавасць у шырокай грамадскасці і да стану сённяшняга паэтычнага слова і да асабліваснасцяў нацыянальнай кнігавыдавецкай практыкі апошніх гадоў...»

— Каб лепш патлумачыць сэнс гэтай публікацыі, мне хацелася б правесці паралель. Для кожнай маці яе дзіця бачыцца самым лепшым. І ёй хочацца, каб пра яе дзіця ўсе гаварылі, усе ім захапляліся. Пэўна, тое ж самае можна сказаць і пра творцаў, пра паэтаў, — гаворыць Раіса Андрэеўна. — Літаратура ім бачыцца самым важным і лепшым, што ёсць у свеце — гэта і духоўнасць, і густы, і цудоўнае пісьменства, якое наталяе прагу да хараства, ачышчае. Тая ж паэзія можа быць як прызнанне чалавечага служэння іншым, як малітва, як споведзь. Зразумела, творцам хочацца, каб паэзія займала ў нашым жыцці самае высокае месца, якога яна вартая. Хочацца, каб пра паэзію гаварылі, пісалі, каб ёю захапляліся. Адным словам, каб паэзія жыла ў жыцці кожнага чалавека. На вялікі жаль, у нашым жыцці прысутнічае адзін момант: той самы кніжны рынак, які сёння існуе. Само паняцце «рынак» гаворыць пра тое, што ўсё робіцца на патрэбу. Рынак — гэта шматколерны кірмаш, у якім бывае нават цяжка разабрацца, дзе, што і як. Так і пісаць што-небудзь спрабуюць многія людзі. З аднаго боку, гэта гаворыць пра тое, наколькі прыцягальная паэзія. А з другога — замінае сапраўднай, вялікай паэзіі. Таму што зніжаюцца густы, размываецца этыка прыгожага слова. Ідзе нейкі падмен сапраўдных каштоўнасцяў. Тым больш, што паэтычная кніга — гэта не раман, не тоўсты том. Можна выдаць зборнічак у прыватным выдавецтве, з памылкамі, неахайны, але гэта ўжо падстава казаць: «Я паэт. Я кнігу маю...» На сёння, мне думаецца, узнікаюць вялікія праблемы з паэзіяй — ёсць небяспека, што гэты самы высокі літаратурны жанр будзе прыніжаны. Таму мы вырашылі яшчэ раз пагаварыць пра паэзію, пра яе каштоўнасці, пра высокія мастацкія ўзоры, якія застаюцца на вяршыні нават нягледзячы на змены часу. І мы звярнуліся да паэта, навукоўца і нашага аўтара Віктара Яраца з пытаннем, што змянілася за гэты час? Ён у адказ даслаў нам свой артыкул «Ці адбылася спрэчка?»

Аўтар падкрэслівае, што яго погляд суб'ектыўны: «Спрабуючы скласці сваю анталогію беларускага верша XX стагоддзя, я выразна ўяўляў, цалкам усведамляў, што ў кагосьці (і гэта зразумела-ясна, як Божы дзень) ёсць іншае бачанне таго ці іншага лірыка, яго месца ў страі вершатворцаў (а я веў гаворку выключна пра лірычныя жанры, толькі пра іх, не закранаючы не ліра-эпас (вершаваны), ні публіцыстыку і г.д.), што нехта будзе не згодны з тымі альбо іншымі маімі меркаваннямі і адносна пабудовы самой канструкцыі 100 паэтаў, і адносна «прапіскі» на яе паверхах пэўнага творцы».

— Безумоўна, у кожнага могуць быць свае крытэрыі, па якіх чалавек вызначае лепшых паэтаў, — лічыць Раіса Баравікова. — Гэта залежыць ад густу, ад разумення, што ёсць паэзія. Ад нейкіх асабістых прыхільнасцяў. — Ён выбраў лепшых на свой погляд. І гэта не тысячы паэтаў, імёны якіх можна пералічваць доўга-доўга. Ён абмежаваўся імёнамі 100 паэтаў, таму што справа не ў колькасці творцаў. У кожнай краіне можна знайсці і вызначыць нейкае кола, якое з'яўляецца арыенцірам, паказвае напрамак да паэзіі. Віктар Рац абгрунтаваў сваю анталогію, напісаў вельмі цікавы артыкул, у якім выклаў свае разважанні пра паэзію. Увогуле пра каштоўнасці прыгожага пісьменства, мастацкага слова. Гэта зноў размова пра паэтаў. Але яны дапамагаюць дакрануцца да загадкавай зоркі паэзіі.

Мы ў першым нумары «Маладосці» друкуем гэты артыкул, а далей хай спрачаюцца паэты, спрачаюцца крытыкі, настаўнікі выказваюць сваё меркаванне. Хай увогуле людзі думаюць. Мы запрашаем да размовы шырокае кола людзей, якія цягнуцца да літаратуры і не могуць ацаніць свой шлях — трэба ім гэтым займацца ці не трэба. Як вызначыць, дзе паэзія, а дзе — не? Наўрад ці па колькасці напісаных радкоў. Прывяду прыклад: Максім Багдановіч рана пайшоў з жыцця, мала напісаў, калі параўнаць з Пушкіным — там столькі тамоў! А тут напісана мала, але так... Гэта чыстая паэзія, цэлае стагоддзе яна пражыла, стала класікай і застанецца класікай яшчэ на многія стагоддзі. Вось загадка паэзіі! Ці ў рускай паэзіі быў Цютчаў — маленькі томік вершаў, а ўсе чытаюць. І таксама стаў класікам. Таму няхай людзі пачытаюць пра лепшых паэтаў і задумаюцца: а ці варта чалавеку пісаць і нейкім чынам прыніжаць сябе і паэзію, калі ён не можа гэта рабіць годна? Можа лепш весці нейкія жыццёвыя дзённікі? Таму што калі такая «рынкавая» сітуацыя будзе працягвацца далей, то мы абясцэнім і паэзію, і ўвогуле літаратуру. Трэба пра гэта шырока гаварыць, я лічу. Прыйшоў той час, калі трэба гаварыць пра этыку, пра самыя вяршыні мастацтва, гаварыць пра тое, што ёсць сапраўднае, вялікае мастацтва. Тым больш, што ў літаратуру прыходзіць новае пакаленне нашых чытачоў, школьнікаў. А што яно чытае і што будзе чытаць далей? А мы ж хочам, каб чалавек вырастаў гарманічным, каб ён быў духоўна прыгожым, каб у ім жылі ўзнёслыя пачуцці. Гэта патрэбна моладзі, і асабліва ёй, таму што асноўны чытач паэзіі — малады чалавек.

Першая дзесятка паэтаў, на думку Віктара Яраца, выглядае так:

Янка Купала, Максім Багдановіч, Якуб Колас, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Пімен Панчанка, Анатоль Вялюгін, Аляксей Пысін, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі...

Але далей ёсць яшчэ дзевяць дзесяткаў.

«Увогуле, пытанне пра крытэрыі мастацкіх вартасцяў, пры ўсёй яго складанасці, неаднатыпнасці, і досыць рэальна адчувальнае. Тут, перш за ўсё, які талент — такія і «краса і сіла» (Максім Багдановіч) твора. Але ж і суб'ектыўны фактар істотны, нярэдка — вызначальны. Таму і шлях да аб'ектыўнага вердыкту не такі гладкі, прасталінейны, а хутчэй — выбоісты, з калдобінамі і аб'ездамі».

— Мы спадзяёмся, што зноў, як мінулы раз, узнікне нейкая шырокая дыскусія, — працягвае Раіса Андрэееўна. — Магчыма, хтосьці з крытыкаў або паэтаў захоча скласці сваю анталогію паэтаў, яна таксама можа мець права быць надрукаванай, пра яе можна гаварыць. Мы гэта робім дзеля таго, каб яшчэ раз можна было ўважліва паглядзець на гэтую госцю нябесную: што яна ёсць, што яна будзе. Каб зразумець, што яна нікуды не знікае з жыцця, проста магчыма нейкім чынам мяняе сваё аблічча. Таму што ёсць розныя літаратурныя плыні, асабліва сярод маладых. Ідзе пошук, кожны шукае свой шлях у літаратуру. А потым прыходзіць да адной высновы: калі гэта сапраўдная паэзія, то сапраўднай паэзіяй яна і застанецца. Таму што пры жыцці, калі глядзіш на нашых сучаснікаў — шмат паэтаў сярод іх. Мінаюцца дзесяцігоддзі і, на вялікі жаль, застаюцца адзінкі.

«Прайшло ўжо больш як шэсць гадоў з моманту з'яўлення «Прэлюдыі...» І што ж кардынальна змянілася за гэты час, што б я, як аўтар, хацеў падкарэктаваць, перагледзець, удакладніць і перайначыць? Па вялікім рахунку — не так і многа. Бадай, усё тое, што канцэптуальна было выкладзена ў маіх тэзісах-развагах, выказана ў якасці аргументаў і высноў, я не схільны і сёння адмаўляць і перакрэсліваць. Устойлівае, дамінантнае застаецца. Гэта так. Але ж час ішоў, з'яўляліся новыя прачытанні розных аўтараў, адкрываліся многія малавядомыя старонкі і з творчай спадчыны, на першы погляд, малапрыкметных аўтараў...»

«...І калі б мне зараз давялося складаць анталогію верша XX — пачатку XXI стагоддзя, то асноўны легіён творцаў застаўся б амаль нязрушаным са сваіх ранейшых месцаў. Паўтарыся: з пэўнымі, нязначнымі карэктывамі, з улікам таго, што зроблена аўтарамі за апошнія гады».

— У прынцыпе, у анталогіі Яраца, якую мы змяшчаем у першым нумары новага года, не шмат нейкіх змен, — удакладняе Раіса Андрэеўна. — Ён проста пашырае яе, адкрывае для сябе нейкія новыя старонкі ў паэзіі і робіць перагляд ранейшай публікацыі. І гэта натуральна. У прынцыпе, вялікіх змен і не можа быць. Таму што калі аўтар адбіраў анталогію, ён жа арыентаваўся на самыя высокія ўзоры паэзіі. Ён прыйшоў да такой высновы, што пра паэта цяжка памяняць думку. Калі ёсць паэт, калі аднойчы было ўзрушэнне, то яно і застаецца, тым больш, там усе імёны вельмі вартыя. А калі арыентуешся на самых лепшых, то разумееш насамрэч высокі статус паэзіі як высокага мастацтва, якое ўздзейнічае на душу. Дзеля таго, каб у чалавеку працягвала жыць душа, і пішуцца артыкулы, і ствараюцца падобныя анталогіі. Паглядзіце: тады было шмат водгукаў. Іх справакавала прыватная ініцыятыва, як цяпер модна казаць, прыватны літаратурны праект. Час ідзе, многае мяняецца, на многае па-іншаму глядзіцца. Можа і некаторыя з вашых чытачоў перагледзелі свае меркаванні? Вось паглядзім.

«Разумею, нехта хоча, каб у анталогіі было больш аўтараў. Калі ласка, рэалізуйце свае задумы. Але ёсць такая лічба — сто, на якой я спыніў свой асабісты выбар. Нехта зробіць інакш — і ён мае на тое поўнае права».

— Мне думаецца, што мы зрабілі правільны ход і вялікі дзякуй Віктару Ярацу, што ён пагадзіўся і папрацаваў над артыкулам і анталогіяй. Вялікі дзякуй і «Звяздзе», што вы не раўнадушна ставіцеся да гэтай тэмы, што знаёміце з паэтычнай класікай і заклапочаны паэтычнай будучыняй Беларусі. Сапраўды, паэзія — вечная тэма, як і само жыццё. Яна нікуды не знікае, нават самы неспрыяльны час не можа яе стрымаць. Калі паглядзець назад скрозь тысячагоддзе — нават неадукаваны чалавек складаў вершы і гэта называецца цяпер фальклорам, якім мы з задавальненнем захапляемся. Таму што ёсць у людзях прага да прыгожага, да таго, што іх узвышае над побытам, над чымсьці вельмі прыземленым. Вядома ж, бываюць розныя часы. Ёсць часы спрыяльныя для паэзіі, ёсць часы неспрыяльныя. І тут ужо завязваюцца ў вузел самыя розныя аспекты, таксама і жыццёвыя. Тут можа ісці гаворка, што грамадства не жыве паэзіяй, а яно ў нашым стракатым свеце і вельмі хуткім часе існуе вельмі прагматычна, вырашаючы свае жыццёвыя праблемы. Усё падмяняецца спрошчаным жыццём, дзе пануе прыгожая карцінка: ёю зараджае тэлебачанне, розныя відовішчы, яна ўпаўзае ў наша жыццё разам з бліскучым глянцам, за якім часта нічога не стаіць, які нічога не дае для душы. Але ж вядома яшчэ з часоў Рыма, наколькі небяспечнае агульнае захапленне відовішчамі. Мы нагадваем, што для чалавека важнае слова — яно было нам дадзена найперш, як Боскі цуд, як незаменны скарб. І мы яшчэ не анямелі настолькі, каб не адчуваць шчырасць і прыгажосць слова. Урэшце, слова патрэбна для споведзі душы...

Ларыса ЦІМОШЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	16.01	7.34
Віцебск —	8.24	15.44	7.20
Магілёў —	8.18	15.51	7.33
Гомель —	8.06	15.56	7.50
Гродна —	8.41	16.17	7.36
Брэст —	8.33	16.26	7.53

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Настассі, Фядоціі, Яўціхія;*
К. *Альжбеты, Анэлі, Рыгора, Яўгена.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА
-8..-6°С	-12..-10°С	-9..-7°С
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ
-11..-9°С	-13..-11°С	-9..-7°С

Дзве даты

4 студзеня

1643 год — Нарадзіўся Ісаак Ньютан, англійскі матэматык, механік, астраном і фізік, стваральнік класічнай механікі, адкрывальнік закона сусветнага прыцягнення, прэзідэнт Лонданскага каралеўскага таварыства. Работы Ньютана намнога апярэдзілі агульны навуковы ўзровень яго часу.

1772 год — Кацярына II і Фрыдрых II заключылі дагавор аб падзеле Рэчы Паспалітай. Яшчэ ў 1764 годзе Расія ўступіла ў саюз з ворагам Аўстрыі, Фрыдрыхам Прускім, для сумесных дзеянняў адносна Рэчы Паспалітай. Менавіта Фрыдрых выказаў думку аб падзеле гэтай дзяржавы паміж яе суседзямі — Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. Кацярына згадзілася на падзел таму, што не магла даць адпору Прусіі і Аўстрыі, знаходзячыся ў стане вайны з Турцыяй.

Цытата дня:

«Задача жанчыны — пабуджаць у мужчыне энергію душы, запал высакародных страсцяў, падтрымліваць пачуццё абавязку і імкненне да высокага — вось яе прызначэнне, і яно вялікае і свяшчэннае».

Вісарыён Бялінскі (1811—1848), рускі літаратурны крытык.

Міжнародны клуб

НАШЫ ПАРТНЁРЫ — В'ЕТНАМ І ПОЛЬШЧА

Ёсць напрацоўкі на перспектыву

Дынамічна развіваўся летась двухбаковы гандаль паміж Беларуссю і В'етнамам. За 10 месяцаў аб'ём тавараабароту паміж дзвюма краінамі вырас на 30,3 працэнта і склаў 49 мільёнаў долараў. Адбылося гэта за кошт павелічэння беларускага экспарту па такіх пазіцыях, як калійныя ўгнаенні, шыны, вырабы з чорных металаў, ліцейнае абсталяванне і друкаваныя пласты.

Стабільна ў апошнія гады нарошчвае свае пастаўкі ў гэту краіну Паўднёва-Усходняй Азіі Мінскі трактарны завод. Цікавыя напрацоўкі з в'етнамскімі партнёрамі на перспектыву маюць таксама аб'яднанне «Інтэграл», Мінскі падшыпнікавы завод, шэраг прадпрыемстваў канцэрна «Белдзяржхарчпрам».

Барыс ЗАЛЕСКІ, дырэктар РІА «Міжнародны клуб».

Производитель купальных костюмов установит сотрудничество в Беларуси.
Есть возможность представлять интересы нашей фирмы на привлекательных условиях.
Polska / Польша
91-612 Łodz, ul. Spiska 9
Тел./факс: 8-10-48-42-656-70-12.
Тел. моб.: 8-10-48-602-854-239, 8-10-48-602-848-966.
E-mail: anti@anti.pl
www.anti.pl

Віншую ***Волечку АБРАМОВІЧ*** *з г. Баранавічы з Новым годам і Нараджэннем Хрыстовым. Жадаю ўсяго самага найлепшага.*

Юрась з Ганцавічаў.

Віншуем дарагога і любага чалавека, ***Рыгора Уладзіміравіча ПІВАВАРАВА*** *з г.п. Лельчыцы з 60-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту, душэўнага спакою на многія гады.*

Жонка, дзеці, унукі.

Пажаданні здароўя, поспехаў, радасці і ўдачы ***Яніне Іванаўне ПАШКОЎСКАЙ*** *з г. Мінска з нагоды слаўнага юбілею.*

Марыя, Дзмітрый, *г. Стоўбцы.*

Віншуем з днём нараджэння паважаную ***Кацярыну Рыгораўну ДЗЯСЯЦКУЮ*** *з в. Старыя Дарогі. Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту і радасці на доўгія гады.*

Родныя, суседзі, сябры.

Зімовыя зацемкі

Аб самым галоўным, або У пошуках тэмы

Пазваніў пастаянны чытач ната-так і спытаў, чаму я так мужыкоў не люблю. Вось так, ні больш, ні менш. «То яны ў вас «лаўрэаты», то аматары маладых дзяўчат і шукальнікі прыгод. А што, жанчыны лепшыя?— не супакойваўся тэлефонны суразмоўца. — Пра сябе, любых, слабо праўду напісаць?»

Можна, падумала я. Тым больш што нядаўна калега расказала выпадак амаль анекдатычны. Праўда, ёй тады было зусім не да смеху. Антаніна з самых добрых намераў вырашыла дапамагчы аднакурсніку, які трапіў у складаную сітуацыю. Без работы застаўся мужык. Сям'я ж, дзеці, жонка пілуе. Ён сам прасіў Тоню, калі дзе пачуе пра вакансію па нашай спецыяльнасці, каб падказала. І тут, лічы, пашанцавала. Гаварыла неяк з прыяцелькай, рэдактарам сталічнай галіновай газеты, тая абмовілася, што няблага было б мець уласнага карэспандэнта. Антаніна Мікалаеўна парэкамендавала памянёнага чалавека, дала адпаведную характарыстыку. І на другім канцы провада згадзіліся.

Здавалася, справа зроблена. Антаніна тут жа вырашыла паведаміць прыемную навіну. Потым моцна пашкадавала, што набрала хатні нумар. Можна ж было пазваніць на мабільны. Але хто б мог падумаць, што так будзе: наадварот, прадчувала падзяку за дапамогу, работу знайсці сёння — не смешачкі... Трубку падняла жонка. На дзяжурную просьбу паклікаць да тэлефона, назавём яго Іванам Пятровічам, пачула: «А ты хто такая?!» Далей ішоў тэкст непракладальны і нецэнзурны. Калі прайшоў першы шок ад пачутага, змагла неяк сабрацца з думкамі і вымавіць: «Калі так, то самі яго на работу і ўладкоўвайце». Яму потым усё-такі пазваніла на мабільны і сказала адну фразу: «Дзе вы толькі жонак бераце?». Вось гэту тэму я хацела развіць, загаловак быў гатовы, глядзі папярэдні сказ. Але падумала, што пакрыўдзяцца мае таварышы па полу. Тым больш перад святам.

А тут у сяброўкі — душэўная рана, якую я спрабую беспаспяхова не тое што залячыць — хоць крыху абязбаліць. Каханы чалавек раствараўся ў вялікім свеце, пакінуўшы ёй толькі «іголку, што засела ў сэрцы». Нашу ёй горы літаратуры па псіхалогіі, даю вельмі разумныя парады, якія дзейнічаюць нібы на мёртвага прыпарка. Стараюся адцягнуць увагу неўкімі выхадамі ў свет, запрашаю самых вясёлых знаёмых на чай. Нічога не дапамагае. Як апошні аргумент, валаку газетную выразку з матэрыялам пра інжынера жаночых душ Вікторыю Токараву. Цытую нашага з ёй любімага аўтара: «У жанчын-пісьменніц многа агульнага. Адна і тая ж туга па ідэалу». На пытанне, хіба мужчынам гэта не ўласціва, Вікторыя Самойлаўна адказвае катэгарычна: «Практычна не. Мужчына будуе мост і асемняне пагалоўе. Яго задача — як мага болей пабудаваць і асемняніць. А жанчына ўзыходзіць да Бога праз мужчыну. Для жанчыны самае галоўнае — мужчына. А такога, як трэба, няма, а тыя, якія ёсць, на ідэал зусім не цягнуць. Адсюль і туга».

Мне захацелася паразважаць на гэту тэму, і загаловак ужо быў — «Будаўнікі мастоў», але я падумала, што пакрыўдзяцца чытач, што званіў зранку. Зусім пакрыўдзяцца. А ён — наш падпісчык. Пастаянны. І вырашыла напісаць зусім пра іншае. Тэму падказала праграма «Час» сваім невялікім сюжэтам з ізраільскага паштовага ведамства.

Ніколі не магло прыйсці ў галаву раней, што людзі пішуць пісьмы Богу. Сапраўды, з усіх канцоў свету ідуць пісьмы з адрасам: «Іерусалім, Госпаду Богу». Як вядома, у гэтым горадзе ёсць знакамітая Сцяна Плачу. Туды турысты, паломнікі ўсіх канфесій старацуцца пакласці запіскі з просьбамі. Ліцыцца, што ад сцяны самы кароткі шлях да Божага разумення і ласкі. Аказваецца, просьбы не толькі адносяцца асабіста, але накіроўваюцца таксама па пошце. І атрымлівае такіх пісьмаў ізраільская пошта цэлыя мяхі. Дык вось парадуальна нядаўна там з'явілася служба, якая чытае лісты. Яно і зразумела, знаходзяцца «дзівакі», што пішуць усялякія глупствы ці нават нецэнзуршчыну. Такія допісы адразу выкідваюцца ў сметніцу. А шчырыя просьбы адносяцца да сцяны і закладваюцца паміж старажытнымі мурамі. Нешта накшталт пісьмаў Дзеду Марозу. Толькі казачнаму персанажу пішуць дзеці, а тут аўтарамі выступаюць дарослыя. Інтэрв'ю даваў чалавек, які чытае рускамоўную і англамоўную пошту. Ён сказаў, што часцей за ўсё людзі пішуць аб самым галоўным. На першым месцы па колькасці — просьбы аб здароўі, а на другім — справы сардэчныя. Дасылаюць лісты і мужчыны, і жанчыны. Ёсць сярод пісьмаў асабліва хвалюючыя, кранальныя. Адзін мужчына, напрыклад, прасіў Усявышняга аб магчымасці ўбачыць яшчэ раз хоць у сне жонку, аб смерці якой ён вельмі смуткуе. Людзі просяць аб тым, каб сустрэцца, каб не расставацца, каб іх разумелі. З Новым годам цябе, дарагі чытач, хай табе не здраджвае каханне.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СПАРТЫЎНЫ 2007 ГОД ЗАПОМНІЦЦА...

У пачатку 2007-га ў кагосьці з нашых чытачоў магла ўзнікнуць думка, што гэты год не будзе настолькі ж цікавым і багатым на спартыўныя падзеі, як папярэдні, бо на яго не выпалі ні Алімпійскія гульні, ні чэмпіянат свету па футболе. Аднак год парсючка запомніцца балельшчыкам: у адных відах спорту беларусы гучна заявілі аб сабе ўпершыню, сталі аўтарамі сенсацыйных перамог, у іншых — вярнулі сабе былую славу. Падводзім вынікі 2007-га перадалімпійскага года разам са «Звяздой».

Лідары года

На сёлетнім чэмпіянаце свету ў японскай Осацы **лёгкаатлет Іван Ціхан** выйграў свой трэці тытул у кіданні молата. Гэта неверагодны выпадак у спартыўным свеце. Праўда, шлях фаварыта спаборніцтваў да свайго чарговага «золата» быў вельмі драматычным: толькі ў апошняй спробе молатабаец забяспечыў сабе выхад у фінал. Аднак на тое ён і лідар, каб выконваць максімальную задачу ў любой сітуацыі. А вось веславальшчыца Кацярына Карстэн заваявала на сёлетнім чэмпіянаце планеты ўжо сваю пятую (!) узнагароду найвышэйшай якасці. Цікава, што на першай палове фінальнай дыстанцыі яна дазволіла крыху парадавацца саперніцы з Чэхіі, як даваў фору канкурэнтам і Іван Ціхан. Маладым беларускім спартсменам ёсць з каго браць прыклад.

Каманда года

У пачатку года хакеісты мінскага «Юнацтва» заваявалі Кантынентальны кубак. Гандбалісты нацыянальнай зборнай забяспечылі сабе ўдзел у чэмпіянаце Еўропы пасля 13-гадовага перапынку. З дваццацаю медалямі вярнуліся з ЧС кікбаксёры, з чатырнаццаццю — каманда па тайландскім боксе, з трынаццаццю — самбісты. Другі год запар чэмпіёнам Беларусі стала футбольная каманда БАТЭ, прычым гэты тытул барысаўчане атрымалі датэрмінова. Няблага БАТЭ паказаў сябе і на еўраарэне. Аднак званне самай лепшай каманды гэтага года «Звязда» аддае **нацыянальнай жаночай зборнай па баскетболе:** дэбютанткі Еўра сталі бронзавымі прызёрамі, а на шляху да трэцяга месца выйгралі ў дзеючых чэмпіёнак кантынента.

Сенсацыі года

Для кагосьці нечаканым стаў вынік заключнага адборачнага матча з удзелам футбалістаў Беларусі і Галандыі, дзе нашы ігракі святкавалі **перамогу над «аранжавымі»,** другую ў гісторыі нашага футбола. У «зімнікаў» аўтарам сенсацыі стаў 19-гадовы магіляўчанін **Леанід Карнеенка.** Ён упершыню ў гісторыі беларускіх лыжных гонак узняўся на другую прыступку сусветнага п'едэстала. Ад дэбютанта такога дасягнення ніхто не чакаў (Лёню ўключылі ў склад каманды ў апошні момант, каб ён набіраўся вопыту). З «летнікаў» спартыўнае асяроддзе больш за ўсё ўскалыхнула **Таццяна Драздоўская,** якая прынесла нашай краіне першае «золата» чэмпіянату свету па парусным спорце. Дзякуючы мінчанцы, Беларусь далучылася да марскіх дзяржаў. Нездарма Таццяна казала саперніцам, што ў Беларусі ёсць сваё мора — Мінскае, хоць яно і памерам з возера.

Адкрыццё года

Гэты 19-гадовы юнак даказаў, што ў Барысаве ёсць не толькі футбол, але і сапраўдныя асілкі. **Андрэй Арамнаў** (вага да 105 кг) сёлета двойчы стаў наймацнейшым у свеце — на чэмпіянаце сярод юніёраў і на дарослым першынстве планеты. Дэбютанта сусветнага форуму прэтэндэнтам на ўзнагароды наогул не называлі. Будзем спадзявацца, што новая «зорка» ў беларускім спорце не ператворыцца ў знічку ў будучым.

Спартыўны характар года

Павагу балельшчыкаў заслужыла паралімпійская чэмпіёнка па лыжных гонках **Людміла Волчак,** якая сёлета з поспехам рэалізавала сябе ў новым відзе спорту — акадэмічным веславанні. Яна стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету ў заездзе на 1000 м сярод спартсменаў з абмежаванымі магчымасцямі, прычым уступіла пераможцы крыху больш за секунду. Людміла заваявала ліцэнзію на Паралімпіяду ў Пекіне.

Эксперыменты года

Прадстаўніца мастацкай гімнастыкі **Валерыя Курыльская** стала мадэллю Нацыянальнай школы прыгажосці і прадставіла Беларусь на конкурсе «Міс Еўропа юніёр», дзе заваявала тытул «Міс талент». Акрамя таго, спартсменка, якая ўжо сабралася завяршыць сваю кар'еру, раптам заявіла аб жаданні застацца ў гімнастыцы і аб тым, што яна пераходзіць з індывідуальнага праткыкавання ў... групавое.

Нападаючага брэсцкай футбольнай каманды «Дынама» **Дзмітрыя Мазалеўскага** галоўны трэнер зборнай Беларусі Бернд Штанге паставіў на месца крайняга абаронцы. Нягледзячы на такія вольнасці, наша каманда выйграла свой таварыскі матч з Ізраілем.

Гучныя кантракты года

У гэтым годзе нацыянальную футбольную зборную ўпершыню ўзначаліў **нямецкі спецыяліст.** Прыход Бернда Штанге ўскалыхнуў нашу дружыну, якая завяршыла адборачны цыкл да Еўра-2008 на чацвёртым месцы, а гэта лепшы вынік у гісторыі яе выступлення. Гучным стаў **пераход самага паспяховага ў апошнія гады беларускага настаўніка Ігара Крыушэнкі** з барысаўскага БАТЭ ў мінскае «Дынама». Змена трэнерскага месціка ў рамках нацыянальнага чэмпіянату, ды яшчэ пераход у каманду, якая лічыцца самым прынцыповым сапернікам барысаўчан, выклікае здзіўленне. Тым больш што ў шматлікіх інтэрв'ю Ігар Мікалаевіч казаў, што, калі мяняць месца працы, то толькі, каб пераходзіць у больш моцны чэмпіянат. У спісе самых гучных кантрактаў і 19-гадовы абаронца БАТЭ Ягор Філіпенка, які **перабраўся ў маскоўскі «Спартак»** на пяць гадоў.

Юбілеі года

На 2007-ы выпалі **25-годдзе** перамогі мінскага «Дынама» ў чэмпіянаце Савецкага Саюза і **70-годдзе** начальніка каманды ў 1982-м Леаніда Гарая. Столькі ж **(70 гадоў)** споўнілася і першаму беларускаму алімпійскаму чэмпіёну Сяргею Макаранку, які выступаў на каноэ-двойцы. Сёлета юбілей быў і ў ДТСААФ — **80 гадоў.** Тэнісіст Максім Мірны і фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі справілі сваё **30-годдзе,** а чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка па фехтаванні Алена Бялова, якая ўзначальвае Вышэйшую школу трэнераў, — **60-годдзе.** Сёлета юбілей і ў хакеіста Руслана Салея, які правёў у НХЛ свой **700-ы матч.**

Бацькі года

Гэты год быў багаты на нараджэнне хлопчыкаў. Цікава, што ў беларускіх футбалістаў з'явіліся сыны. Бацькамі сталі нападаючыя **Віталь Булыга і Віталь Кутузаў,** паўабаронцы **Цімафей Калачоў і Дзяніс Коўба.** Сын сёлета з'явіўся на свет у сям'і фрыстайліста **Дзмітрыя Дашчынскага**, і ў легкаатлетаў **Наталлі Харанекі і Андрэя Міхневіча,** а вось у тэнісіста **Максіма Мірнага,** біятланісткі **Вольгі Назаравай** нарадзіліся дочкі.

Няўдачнікі года

Сёлета ўдача ў чарговы раз адвярнулася ад хакеістаў мінскага **«Керамін».** Пераможцы рэгулярнага першынства не змаглі стаць чэмпіёнамі Беларусі ў фінальных матчах. Упусцілі «драконы» і Кубак краіны. Адвярнулася фартуна і ад футбалістаў сталічнага **МТЗ-РІПА,** якія да апошняга тура нацыянальнага чэмпіянату захоўвалі шанц заняць прызавое месца, а ў выніку сталі толькі пятымі.

Вяртанні года

У маі завяршылася дыскваліфікацыя хакеіста нацыянальнай зборнай Беларусі **Цімафея Філіна,** якую ігрок адбываў два гады. У спорт вярнулася і алімпійская чэмпіёнка Сіднея **Яніна Карольчык.** У прынцыпе яна магла зрабіць гэта раней, але Яніна прапусціла спаборніцтвы з-за нараджэння дачкі.

Рэмейк года

У матчы расійскай суперлігі супраць «Нафтахіміка» беларускі легіянер «Салавата Юлаева» **Канстанцін Кальцоў паўтарыў знакамітую атаку ЧС-2006** па футболе ў выкананні футбаліста Зідана. На месцы Матэрацы аказаўся абаронца Дзяніс Гроць, на якога беларус напаў у адказ на ўдар клюшкай па руках. Кальцоў быў выдалены да канца матча, а гульня завяршылася перамогай яго каманды.

Інцыдэнт года

На чэмпіянаце свету па мастацкай гімнастыцы перад пачаткам практыкавання беларуска Іна Жукава ледзь не пацярпела. У некалькіх сантыметрах ад дзяўчыны ўпала бутэлька з манетамі, якую выпусціла з рук адна з глядачак. Калі б яна аказалася больш дакладнай, наша «мастачка» магла б атрымаць траўму, і тады — бывай Алімпіяда ў Пекіне.

Учынак года

Такога, каб чалавек ва ўзросце выйшаў на поле ў афіцыйным матчы, у беларускім футболе раней не было. Аўтарам рэкорда стаў **53-гадовы Юрый Пудышаў,** прычым зрабіў ён гэта вельмі адметна: апрануў майку МТЗ-РІПА пад нумарам 53, а выйшаў на поле на 82-й хвіліне, бо быў капітанам